

**Сацабслугоўванне: клопат пра старэйшых**

СТАР. 3



**Культура стварае сталіцы**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЛІСТАПАДА 2015 г. ПЯТНІЦА № 215 (28073) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Хай добрымі будуць імгненні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел МЯРКУЛАЎ, дырэктар Арлоўскага філіяла Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце РФ**

***(падчас наведвання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі):***

*«Ваша краіна прыйшла да стабільна высокіх тэмпаў развіцця. У Канстытуцыі Беларусі прапісана будаўніцтва сацыяльна арыентаванай, прававой дзяржавы, і сваёй дзейнасцю гэта пацвярджае Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Па-добраму я рады за Беларусь. За 20 гадоў вы змаглі пераўзброіць машынабудаванне, падняць узровень сельскай гаспадаркі, а гэта дарагога каштуе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.11.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 17505,00 ▲ |
| Еўра | 18999,00 ▼ |
| Рас. руб. | 276,20 ▼ |
| Укр. грыўня | 762,75 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АСАЛОДА Ў ЛІСТАПАДЗЕ

## Сёння ў сталіцы адкрываецца міжнародны кінафестываль

**У сталічным кінатэатры «Масква» сёння будзе разбіта талерка аб штатыў кінакамеры, чым будзе абазначана адкрыццё XXII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Сёлета ён пройдзе пад дэвізам «Асалода для вачэй». Падчас урачыстасці будзе паказаны фільм адкрыцця — «Даліна любові», дзе сыгралі Ізабэль Юпер і Жэрар Дэпардзье. Галоўным словам на найбліжэйшы тыдзень становіцца «кіно», самі арганізатары ставяць не на шыкоўныя ўрачыстасці, а на добрыя фільмы і таленавітых рэжысёраў. Цырымонію наведае госця фестывалю французская актрыса і рэжысёр Фані Ардан, што стала вядомай пасля ролі ў фільме «Суседка» класіка кінематографа, рэжысёра французскай Новай хвалі Франсуа Труфо. На фестывалі яна ўжо ў якасці рэжысёра прадставіць свой другі поўнаметражны фільм «Неадчэпныя рытмы».**

СТАР. 13

**Удзельнікаў і гасцей XXII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» з яго адкрыццём павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

**У віншаванні гаворыцца, што цяперашні форум асаблівы, ён праходзіць у год 120-годдзя кінематографа — аднаго з самых маладых відаў мастацтва, якое за сваю кароткую гісторыю паспела заваяваць сэрцы мільёнаў людзей.**

**«У нашай краіне прыкладаюцца значныя намаганні для захавання дасягненняў айчыннага кіно, яго развіцця і папулярызацыі ў свеце, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — З года ў год наш фестываль дорыць гледачам радасць сустрэч з новымі фільмамі і іх стваральнікамі, а прафесіяналам дае шырокія магчымасці для актыўнага творчага дыялогу з прадстаўнікамі розных краін».**

**Прэзідэнт выказаў перакананасць, што і ў далейшым форум будзе служыць высакароднай справе сцвярджэння гуманістычных і маральных ідэалаў у сучасным кінамастацтве, умацаванню культурнага супрацоўніцтва паміж народамі.**

# ГАРЫЗОНТЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Беларуска-кітайскія дамоўленасці на вышэйшым узроўні будуць рэалізаваны ў тэрмін

**Пра гэта заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы з намеснікам міністра камерцыі Кітая, спецпрадстаўніком КНР па справах міжнародных перамоў па гандлёвых пытаннях Чжун Шанем.**

Вітаючы кітайскую дэлегацыю, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Дзякую за тыя цёплыя словы, якія выказаў Старшыня КНР пасля абрання мяне Прэзідэнтам, а таксама за тую каласальную падтрымку, якую Кітай ажыццяўляе ў дачыненні да Беларусі».

Падчас сустрэчы кіраўнік дзяржавы адзначыў, што мае намер абмеркаваць з Чжун Шанем увесь спектр тэм беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння. «Што тычыцца асноўных напрамкаў двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку стварэння Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», які Старшыня КНР назваў жамчужынай новага Шаўковага шляху, то я думаю, што тыя задачы, якія былі пастаўлены падчас візіту Сі Цзіньпіна ў Мінск, рэалізуем у тэрмін. А калі мы аператыўна папрацуем, то будзем ісці і з апярэджаннем», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Чжун Шань, які прыехаў прадстаўляць Кітай на інаўгурацыі Прэзідэнта Беларусі, перадаў Аляксандру Лукашэнку найлепшыя пажаданні ад Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і павіншаваў з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах. «Мой удзел у якасці спецпасланніка Старшыні КНР на інаўгурацыі Прэзідэнта Беларусі чарговы раз сведчыць аб вялікай увазе, якую Сі Цзіньпін надае кітайска-беларускаму супрацоўніцтву, а таксама аб глыбокай дружбе з вамі», — сказаў Чжун Шань. Ён лічыць, што добрыя асабістыя адносіны паміж двума лідарамі маюць вялікае значэнне ў развіцці кантактаў паміж Рэспублікай Беларусь і КНР.

На перамовах гаворка ішла аб пашырэнні і паглыбленні ўсебаковага стратэгічнага партнёрства паміж дзвюма дзяржавамі па ўсіх напрамках, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Вялікая ўвага была ўдзелена рэалізацыі канцэпцыі «Адзін пояс — адзін шлях», актыўны ўдзел у якой мае намер прыняць Беларусь.

У цэнтры ўвагі былі пытанні будаўніцтва Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Адзначалася, што парк заклікані стаць цэнтрам міжрэгіянальных беларуска-кітайскіх сувязяў, якім Беларусь і Кітай надаюць вялікае значэнне. Размова ішла таксама аб магчымасці спрашчэння гандлёва-эканамічных сувязяў і ліквідацыі бар'ераў з мэтай паскарэння тэмпаў развіцця беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Акрамя таго, абмеркаваны пытанні рэалізацыі буйных сумесных праектаў, а таксама супрацоўніцтва ў фінансава-крэдытнай сферы. Узаемным было меркаванне аб усебаковым пашырэнні беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння.

# АБСЛУГОЎВАЦЬ ГРАШОВУЮ МАСУ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

**Пасля правядзення дэнамінацыі айчыннай валюты ў ліпені шляхам узбуйнення беларускага рубля ў маштабе 1 да 10 тысяч зменшыцца кошт абслугоўвання грашовай масы ў маштабах краіны мінімум у сем разоў. Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Дзмітрый ЛАПКО.**

Акрамя таго, ён адзначыў, што «палітыка Нацыянальнага банка на 2016 год ужо сёння фарміруе ўзровень унутранай і знешняй збалансаванасці, неабходны для пачатку правядзення дэнамінацыі». Паводле яго слоў, гэта звязана са збалансаванасцю знешнегандлёвага сальда і жорсткай скіраванасцю манетарнай палітыкі на зніжэнне інфляцыі. Намеснік старшыні праўлення лічыць, што станоўчы эфект на плацежны баланс ад рэалізацыі названых захадаў з кожным месяцам павялічваецца. Сёлета на працягу 9 месяцаў дынаміка змены спажывецкіх цэн дэманстравала ўстойлівую тэндэнцыю да зніжэння. Так, са студзеня па верасень у гадавым выражэнні прырост цэн знізіўся з 17,1% да 11,9%. «Як вынік, павышаецца абарона пакупніцкай здольнасці беларускага рубля», — растлумачыў прадстаўнік Нацбанка.

Спецыяліст таксама паведаміў, што сабекошт вырабу адной купюры і адной манеты новага ўзору вагаецца ад 1 да 4 еўрацэнтаў.

Больш падрабязна пра будучую дэнамінацыю «Звязда» раскажа ў наступным нумары.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# МІНІМАЛКА З 1 СТУДЗЕНЯ 2016 ГОДА БУДЗЕ НЕ НІЖЭЙШАЙ ЗА 2,5 МЛН РУБЛЁЎ

**Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ на сумеснай з газетай «Звязда» «прамой лініі» і анлайн-канферэнцыі Мінпрацы і сацабароны на тэму «Пытанні заработнай платы і занятасці насельніцтва».**

Сёння мінімальная заработная плата з улікам індэксацыі складае 2 млн 180 тыс. рублёў. У адпаведнасці з заканадаўствам памер месячнай мінімальнай заработнай платы вызначаецца ўрадам штогод з 1 студзеня не ніжэй памеру мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек, які дзейнічае на пачатак года. Зараз мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек (з 1 лістапада гэтага года па 31 студзеня наступнага года), вызначаны ў памеры 2 499 270 рублёў.

Нагадаем, што мінімальная заработная плата — гэта дзяржаўны мінімальны сацыяльны стандарт у галіне аплаты працы. Гэта самая нізкая мяжа аплаты працы работнікаў за работу ў нармальных умовах на працягу нармальнай працягласці працоўнага часу пры выкананні абавязкаў работніка, якія вынікаюць з заканадаўства, лакальных нарматыўных прававых актаў і працоўнага дагавора. Спецыялісты падкрэсліваюць, што яна забяспечвае сацыяльную абарону работнікаў у аплаце працы.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Падзея

# АД ІДЭЙ — ДА ПОСПЕХУ

**Па словах старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, каб развівацца ў сусветнай эканоміцы, неабходна генерыраваць, ствараць і прадаваць інавацыйныя прадукты. Дзяржава гатова звяртацца да прадстаўнікоў беларускай моладзі па прагрэсіўныя ідэі і новыя падыходы.**

Прадстаўнікі Савета Рэспублікі сумесна з БРСМ будуць садзейнічаць і падтрымліваць ініцыятывы маладых людзей, каб іх праекты маглі пераходзіць ад тэарэтычнай распрацоўкі да рэальнага тавару, які можна было б рэалізаваць на ўнутраным або сусветным рынку. Акрамя таго, разглядаецца магчымасць прыцягнення спецыялістаў з рэальнага сектара эканомікі, каб тыя, у сваю чаргу, актыўна працавалі з маладымі прадпрымальнікамі і навукоўцамі і дапамагалі давесці праекты да камерцыйнага поспеху.

Падчас фарсайт-дыскусіі з пераможцамі першага Міжнароднага маладзёжнага форуму навукі і інавацый краін БРІКС і ЕАЭС і прадстаўнікамі Савета маладых прадпрымальнікаў, старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што за гады суверэнітэту наша краіна дасягнула дастаткова сур'ёзных вынікаў у навуцы і навукова-тэхнічных распрацоўках.

«Нам ёсць чым ганарыцца. Краіна валодае вялікім інтэлектуальным і вытворчым патэнцыялам. Гэта багацце нашай нацыі. Дастаткова сказаць, што каля 30% эканомікі складае апрацоўчая прамысловасць. Гэта значыць, Беларусь — індустрыяльна развітая краіна», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Ён таксама падкрэсліў, што апрацоўчая прамысловасць — гэта адначасова і донар, і рэцыпіент навукова-тэхнічнай і інавацыйнай прадукцыі. Сёння ў Беларусі шмат навуковых школ, вядомых у свеце, а на выніку беларускіх навукоўцаў спасылаюцца вядучыя спецыялісты сучаснасці ў сваіх працах. Можна з упэўненасцю сказаць, што краіна адносіцца да ліку дзяржаў з высокім узроўнем навукова-тэхнічнага патэнцыялу. Па інфармацыі Інстытута Сусветнага банка, па індэксе ведаў з 146 дзяржаў за апошнія тры гады Беларусь паднялася з 52-га на 45-е месца.

«Акрамя таго, мы лічым, што сёння ёсць усе падставы, каб дасягнуць больш высокіх вынікаў», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Па індэксе эканомікі ведаў (наяўнасць у краіне умоў для эфектыўнага выкарыстання навуковых ведаў) за гэты ж перыяд краіна ў рэйтынгу перабралася з 73-й на 59-ю пазіцыю. Старшыня Савета Рэспублікі выказаў думку, што прыярытэты ў навукова-тэхнічнай сферы павінны аддавацца развіццю ў галіне энергетыкі, прамысловай і аграрнай вытворчасці, авіябудавання, нана- і біятэхналогій, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Таксама падчас сустрэчы прайшла прэзентацыя рэспубліканскага праекта «Маладзёжнае прадпрымальніцтва» і стэндавая прэзентацыя аўтарскіх праектаў удзельнікаў конкурсу «100 ідэй для Беларусі» ў сферы робататэхнікі, інфармацыйных тэхналогій, лёгкай прамысловасці і этнакультурных традыцый.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

■ Перспектыва

# Стаўка на прадпрымальніцтва

**Сёння дзяржава робіць стаўку на малы і сярэдні бізнес. Нягледзячы на ўсе праблемы ў сусветнай эканоміцы, гэты сектар не губляе сваіх пазіцый. Такое ўстойлівае становішча прадстаўнікі бізнесу маглі заняць у выніку сумеснай працы з дзяржавай.**

Па словах **намесніка дырэктара дэпартамента па прадпрымальніцтве Пятра АРУШАНЬЯНЦА**, дзякуючы Дырэктыве №4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці» за апошнія пяць гадоў прыняты 193 заканадаўчыя акты, якія лібералізавалі і ўдасканалілі прадпрымальніцкую дзейнасць.

Пазітыўныя змены закранулі розныя пытанні спрашчэння і рэгулявання цэнаўтварэння, кантрольна-наглядной дзейнасці. Скарочана амаль удвая колькасць адміністрацыйных працэдур, а тыя, што засталіся, — уніфікаваныя і спрошчаныя. У галіне ліцэнзавання перыяд падрыхтоўкі дакументацыі скараціўся з 25 да 12 дзён. За апошнія пяць гадоў адбыліся глабальныя змены па ўсіх напрамках. Ужо цяпер Міністэрства эканомікі выступіла з ініцыятывай абнаўлення палажэнняў Дырэктывы №4. Дакумент яшчэ падчас сваёй падрыхтоўкі шырока абмяркоўваўся з дзелавой супольнасцю, прадстаўнікі якой уносілі свае карэктывы.

Напрыклад, сёння існуе праблема выкупу арандатарамі дзяржаўнай маёмасці, у якую яны доўгі час інвеставалі свае сродкі. Існуе правіла, згодна з якім прадпрымальнік мае прыярытэтнае права выкупу дзяржаўнай уласнасці, калі ён арандуе яе звыш трох гадоў. У краіне таксама спрасціліся многія працэдурныя пытанні, якія цяпер можна вырашаць у электронным выглядзе і эканоміць на гэтым час. Аптымізавалі і падаткаабкладанне. Па словах Пятра Арушаньянца, зараз дзейнічае мараторый на змяненне падатковых ставак і ўвядзенне новых падаткаў, а адміністраванне дзякуючы дэпартаменту па прадпрымальніцтве максімальна спрашчаецца і пераходзіць у электронную форму.

За апошнія пяць гадоў бізнес-клімат паляпшаўся не толькі ў буйных гарадах, але і на перыферыі краіны. Асноўным крокам тут стала выданне Дэкрэта №6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці».

«Прымяненне гэтага дакумента мела адчувальны эфект. За 2,5 года колькасць суб'ектаў гаспадарання ў малых гарадах вырасла на 38%. Для параўнання: у буйных гарадах гэтая лічба склала толькі 1,5%. У сельскай мясцовасці стварыліся ўнікальныя прывабныя ўмовы. Прычым гэта датычыцца не толькі гандлю, які сёння хоць і скарачаецца, аднак па-ранейшаму займае найбольшую долю — каля 39%. Папулярна сёння весці бізнес становіцца і ў сектары прамысловай вытворчасці», — падкрэсліў Пётр Арушаньянц.

Актывізацыя дзелавой ініцыятывы адбываецца і за кошт дзяржаўных субсідый. Банк развіцця з 2014 года пачаў рэалізоўваць праграму для малога і сярэдняга бізнесу. Яе асаблівасць заключаецца ў тым, што субсідаванне накіроўваецца ў вытворчасць і носіць доўгатэрміновы характар. За ўвесь перыяд існавання гэтай праграмы ўжо прафінансавана 226 інвестыцыйных праектаў. Сярэдні кошт аднаго такога праекта складае прыкладна 1,5 млрд рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by* ■

• На думку дэпутата



**З кожным годам дзяржава ўсё больш зацікаўлена ў развіцці прыватнага сектара эканомікі. Дэпутат Валерый БАРАДЗЕНЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах, упэўнены: гэтая сфера ў нашай краіне надзвычай перспектыўная.**

— У нас ёсць вельмі вялікі патэнцыял росту якраз у развіцці малога і сярэдняга бізнесу, — гаворыць дэпутат. Сёння трэба рабіць усё, каб развіваць прадпрымальніцтва здольнасці ў грамадзян. У той жа час перад тым, як пачаць свой бізнес, чалавек павінен ведаць, што рабіць усё трэба ў законным рэчышчы, выконваць пэўныя правілы.

***— Якім чынам дзяржава можа дапамагчы прыватнікам?***

— У нас ужо сёння існуе сістэма падтрымкі. Некалькі гадоў на сходах Нацыянальнай платформы вядзення бізнесу загучала, што дзяржава звяртае ўвагу на тыя пытанні, якія ставяцца бізнесам. Але і рухаемся мы настолькі хутка, наколькі нам дазваляюць гэта прадпрымальніцкія здольнасці, жаданне людзей самім адказваць за сябе, самім будаваць сваю будучыню, рызыкаваць сваёй маёмасцю.

Расстаўленыя ў перадвыбарнай Праграме Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі прыярытэты вельмі правільныя. Як бы там ні было, у рыначнай эканоміцы, паколькі мы ўжо пачалі яе будаваць, дзяржава ў меншай ступені адказвае за чалавека, за яго поспехі. За сваю будучыню адказвае сам чалавек.

Як жа можа дапамагчы дзяржава бізнесу? Праблема №1 сёння — гэта стаўкі арэнды. Калі пачынаеш нейкі бізнес, то далёка не ўсё можна рэалізаваць ва ўласнай кватэры.

Прамая фінансавая падтрымка таксама магчымая. Думаю, такая падтрымка павінна выдзяляцца без залежнасці ад формаў уласнасці, на падставе конкурсаў праектаў. Можна яшчэ ўключаць прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу ў нейкія кааперацыйныя ланцужкі. Не заўсёды добра, калі ў такім ланцужку толькі буйныя прадпрыемствы. Часам дробныя фірмы выконваюць заказ больш эфектыўна і больш танна.

Застаецца актуальным пытанне стартавага капіталу. Тыя задачы, якія ставіць перад сабой урад — макраэканамічная стабілізацыя, зніжэнне інфляцыі — вельмі своечасовыя, гэта павінна прывесці да таго, што чалавеку стане прасцей і цікавей пачынаць свой бізнес. Гэта самая істотная падтрымка з боку дзяржавы прыватнікам.

Увогуле, развіццё малога і сярэдняга бізнесу — удзел моладзі. Маладыя людзі павінны быць актыўнымі, яны павінны бачыць, што дзяржава ўсяляк падтрымлівае развіццё іх справы. Колькі б мы ні абмяркоўвалі падатковую сістэму, адміністрацыйную, у аснове любога бізнесу заўсёды ляжыць паспяховая ідэя — запатрабаваная грамадствам, за якую людзі згодны заплаціць.

***— Ці чакаюцца нейкія заканадаўчыя змены ў найбліжэйшыя гады, якія б закранулі працу малых і сярэдніх прадпрыемстваў?***

— Самае вялікае, што мы можам зрабіць у заканадаўстве, і гэта было адзначана на нядаўняй нарадзе ў Прэзідэнта, — гэта... як мага менш яго чапаць. Бізнес цікавіць не столькі сам узровень заканадаўства, колькі яго стабільнасць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# Дапамога і разуменне побач

## Дзякуючы «прамым лініям» людзі ўбачылі, што мясцовая ўлада працуе для іх

**Калі падчас першай суботняй тэлефоннай «прамой лініі» 17 студзеня сёлетняга года апаратары зафіксавалі 1240 спроб дазваніцца ў гродзенскі аблвыканкам, то падчас апошняй, 31 кастрычніка, іх было толькі 93. З чым звязана скарачэнне колькасці зваротаў? З гэтым пытаннем карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да начальніка аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Гродзенскага аблвыканкама Кацярыны ФЕДАСЕНКІ.**

— Хтосьці са скептыкаў можа падумаць, што людзі, маўляў, кінулі тэлефанаваць, бо нічога не вырашаецца. Але на самай справе прычына змяншэння зваротаў (я прысутнічаю практычна на ўсіх «прамых лініях») іншая. Пэўна, многія «балячкі», якія тычыліся праблем у тых ці іншых населеных пунктах, вырашаюцца. І таму зараз значна менш пытанняў, дзе патрабуецца ўмяшанне абласной улады. Безумоўна, любое пытанне, з якім чалавек звярнуўся ў орган улады, нельга лічыць малаважным. Але, разам з тым, звароты па сваёй сутнасці зараз не такія вострыя, як падчас першых «прамых ліній».

***— Чалавек патэлефанаваў на «прамую лінію». І што далей?***

— Многія звароты патрабуюць не столькі прыняцця мер, колькі прафесійных кансультацый. Таму падчас «прамых ліній» у аблвыканкаме працуюць не толькі апаратары шматканальнага тэлефона, але і спецыялісты шэрагу службаў і ведамстваў. Яны растлумачваюць людзям, як трэба дзейнічаць у кожнай канкрэтнай сітуацыі, куды звярнуцца. Такім чынам, вырашаецца пераважная колькасць зваротаў. А ў тых выпадках, калі яны патрабуюць дэталёвага разгляду, дадатковага вывучэння, з заяўнікамі непасрэдна гутараць кіруючыя работнікі аблвыканкама. Пасля чаго даецца адпаведныя даручэнні тым ці іншым структурам улады, узнятыя пытанні бяруцца на кантроль і вырашаюцца згодна з заканадаўствам. Напрыклад, па выніках адной з апошніх «прамых ліній» на кантроль узялі пытанне накont своечасовых разлікаў за яблыкі, здадзеныя на кансервавы завод. Да яго вырашэння падключылі адпаведную абласную структуру.

Хочацца адзначыць, што людзі не толькі скардзяцца, але і выказваюць падзяку за вырашэнне тых ці іншых пытанняў — і па тэлефоне, і пісьмова. Дзякуюць за дапамогу, праяўленую чуласць работнікам і аблвыканкама, і свайго раёна.

***— Але ж зразумела, што не па ўсіх зваротах, асабліва звязаных з фінансавымі затратамі, рэальна адразу ж прыняць меры...***

— Аднак у любым выпадку людзі павінны атрымаць канкрэтны адказ. Пры гэтым можна і папярэдзіць многія звароты дзякуючы інфармаванню людзей, напрыклад па пытаннях рамонту жылых дамоў. На Гродзеншчыне ўжо стала нормай, што адпаведныя спісы чарговасці друкуюцца ў мясцовых СМІ. Гэта дапамагае папярэдзіць званкі ў органы ўлады, хаця, разам з тым, застаюцца пытанні, звязаныя з якасцю рамонтных работ, добраўпарадкаваннем дваровых тэрыторый.

Дарэчы, менталітэт нашых заяўнікаў часта наступны: маўляў, патэлефаную «наверх» — і ўсё хуценька вырашыцца. І станоўчы момант «прамых ліній» мне бачыцца ў тым, што многія людзі нарэшце зразумелі: у іх ёсць мясцовыя органы ўлады, куды трэба звяртацца. І толькі калі там не прымаюць мер, варта тэлефанаваць ці пісаць у вышэйшыя інстанцыі.

А для органаў улады «прамыя лініі» важныя ў першую чаргу тым, што яны дазваляюць быць на пастаянвай сувязі з грамадзянамі, бачыць існуючыя праблемы і іх вырашаць.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■

# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ЗДАРОЎЕ

**За апошняе дзесяцігоддзе ахова здароўя Брэстчыны выйшла на новы, сучасны ўзровень дзякуючы вялікім інвестыцыям. Большасць медыцынскіх аб'ектаў набылі новае абсталяванне, якое ставілі ў адрамантаваныя і рэканструяваныя карпусы. Толькі за апошнія тры гады на будаўніцтва і абнаўленне названых аб'ектаў было затрачана амаль 819 мільярдаў рублёў. Напрыклад, летась уведзена ў строй дзіцячая паліклініка №1 і абласны перынатальны цэнтр у Брэсце. У абласным радзільным доме пачало працаваць аддзяленне для нованароджаных дзяцей з перынатальнай паталогіяй.**

Медыцыну рэгіёна сёння цяжка ўявіць без яе флагмана — абласной бальніцы. За апошнюю пяцігодку ў ёй праведзены рэканструкцыя і мадэрнізацыя карпусоў «А» і «Б», адкрыты шэраг новых аддзяленняў, а старыя пераасначаны на ўзроўні сусветных стандартаў. Крыху раней рэканструкцыю перажылі аперацыйны блок з аддзяленнем рэанімацыі і анестэзіялогіі. Вялікія капіталаўкладанні паспрыялі адкрыццю ў абласной бальніцы такіх высокатэхналагічных аддзяленняў, як кардыяхірургіі і трансплантацыі. Цяпер у кардыяхірургічным аддзяленні за год выконваецца да тысячы аперацый на сэрцы, чвэрць з іх праводзяць на адкрытым сэрцы. Гэта азначае, што для пацыентаў з рэгіёна дапамога стала больш даступнай.

У пачатку гэтага года ўступіў у строй новы корпус абласнога анкалагічнага дыспансера. А цягам года названая ўстанова атрымала некалькі суперсучасных апаратаў для дыягностыкі і лячэння. Многія мільярды рублёў затрачаны на пераасначэнне і мадэрнізацыю бальніц Пінска, Баранавіч, амаль усіх раённых цэнтраў. Падыходзіць да завяршэння рэканструкцыя абласной інфекцыйнай бальніцы, толькі што ўступіла ў строй абноўленае гінекалагічнае аддзяленне Баранавіцкага радзільнага дома, чакаецца адкрыццё спальнага корпуса абласнога цэнтра медыцынскай рэабілітацыі для дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі.

Паспяхова вядзецца мадэрнізацыя ў цэнтральнай гарадской бальніцы. Гэтым летам там значна абноўлена дыягнастычнае абсталяванне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Сацыяльны клопат

# САНАТОРЫЙ... З ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ

## Штогод у краіне з'яўляюцца новыя формы сацпаслуг

**«Санаторый на даму» — гэта пакуль яшчэ новая форма работы з адзінокімі састарэлымі людзьмі і адзінокімі інвалідамі ў нашых сацыяльных службаў, але яна актыўна развіваецца. Галоўная яе мэта — падоўжыць і палепшыць жыццё пажылым.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### ЗАВАРЫЦЬ ФІТАГАРБАТУ, ПАГАВАРЫЦЬ ПА ДУШАХ...

— Мы пачалі практыкаваць санаторыі на даму з кастрычніка мінулага года, — гаворыць **дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ушацкага раёна Алеся ХВАШЧЭЎСКАЯ**. — Да адзінокіх пенсіянераў выязджаюць сацыяльны работнік і тэрапеўт (фельчара замест доктара пасылаем толькі ў самыя аддаленыя вёскі). Калі ёсць такі запыт, да сацработніка і медыка могуць далучыцца псіхолаг, а таксама юрыст. Медык абследуе пажылога чалавека і складае карту прызначэнняў. І ўжо на падставе гэтага да пенсіянера прыходзяць валанцёры і праводзяць усе патрэбныя працэдуры. На працягу 14 дзён заварваюцца фітагарбаты, арганізуецца рэкамендаванае доктарам дыетычнае харчаванне, араматэрапія, праводзіцца масаж... Часам медыкі вучаць самых пажылых людзей прыёмам самамасажу, каб аблегчыць боль у суставах, напрыклад.

> **«Узаемадапамога, дабрыня і міласэрнасць — гэта тое, што заўсёды вызначала нашых людзей. Дапамога хворым і слабым, абарона дзяцей і клопат аб пажылых спрадвеку лічыліся ў нас святой, богаўгоднай справай.**
>
> **Гэтыя векавыя маральныя каштоўнасці мы паклалі ў аснову беларускай сацыяльнай дзяржавы — дзяржавы для народа».**
>
> **(З перадвыбарнай праграмы Аляксандра Лукашэнкі.)**

Праводзім мы і музыкатэрапію — ладзім жывыя міні-канцэрты, з якімі выступаюць таксама валанцёры. Станцаваць кадрылю, праспяваць песні ваенных гадоў ці задушэўныя беларускія народныя — у праграме ўсё тое, што любяць нашы бабулі і дзядулі, якія з велізарным задавальненнем слухаюць і падпяваюць.

Алеся Хвашчэўская не ўтойвае, што старым адзінокім людзям вельмі не хапае зносін. «У асноўным ім патрэбны проста суразмоўцы, — гаворыць яна. — Пагаварыць па душах, выслухаць іх расказы...».

Спецыялісты адзначаюць, што падобныя санаторыі на даму арганізаваны ўжо ў Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай, Гродзенскай абласцях.

А ў Вілейскім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, акрамя «санаторыя на даму» і іншых інавацыйных праектаў, рэалізуецца і праект «Сацыяльная дача», у рамках якога спецыялісты цэнтра арганізуюць адпачынак пажылых грамадзян і інвалідаў у летні перыяд у вёсцы — на базе дома сезоннага пражывання. Мэтай яго спецыялісты бачаць у першую чаргу таксама перадоленне сацыяльнай ізаляцыі і пашырэнне сацыяльных сувязяў пажылых людзей і інвалідаў.

**Па стане на 1 кастрычніка гэтага года на ўліку ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва стаялі 1 809 985 чалавек. Для параўнання: у студзені 2014 года на ўліку ў ТЦСАН стаялі 1,7 млн чалавек.**

### КАЛІ ТРЭБА, ПРЫЕДЗЕ МАБІЛЬНАЯ БРЫГАДА САЦАБСЛУГОЎВАННЯ

Увогуле, у Мінпрацы і сацабароны адзначаюць, што на 1 кастрычніка гэтага года ў нашай краіне абслугоўваюцца на даму 87 641 пажылы чалавек. Штогод тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва абследуюць умовы пражывання адзінокіх грамадзян і высвятляюць, якія яны маюць патрэбы. Можа, трэба дапамагчы нешта адрамантаваць, пераклеіць шпалеры...

Як правіла, самымі запатрабаванымі ў нашых адзінокіх пажылых людзей і тых, хто адзінока пражывае, з'яўляюцца сацыяльна-бытавыя паслугі — дастаўка тавараў, лекаў, прыборка, добраўпарадкаванне прысядзібнага ўчастка, расчыстка снегу і інш. Яны прадастаўляюцца па нізкіх цэнах або наогул бясплатна. Акрамя гэтага, у кожным раёне распрацоўваецца свой дадатковы пералік паслуг, якія прапаноўваюцца ўжо па больш высокім тарыфе. Звычайна ў іх лік уваходзіць колка дроў, рамонт плота, прысядзібных пабудоў, паслугі сацыяльнай цырульні, пральні і інш.

Для большай зручнасці ў сельскай мясцовасці апошнім часам адчыняюцца сацыяльныя пункты — філіялы цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання. На 1 кастрычніка гэтага года, па звестках Мінпрацы і сацыяльнай абароны, у нашай краіне налічвалася 1123 такія філіялы. Вяскоўцаў наведваюць і мабільныя брыгады сацабслугоўвання, у склад якіх могуць уваходзіць псіхолагі і юрысты.

**Сёлета 548 беларусаў перасягнулі 100-гадовую мяжу.**

У розных рэгіёнах краіны дзейнічаюць «дамы зімоўкі». Гэта калі двое ці трое суседзяў аб'ядноўваюцца на зіму і жывуць у адным доме, дзе іх наведвае сацыяльны работнік. Ёсць і «дамы самастойнага пражывання» — гэта калі жылы дом у вёсцы, які пустуе, прыводзіцца ў нармальны стан і ў яго засяляюцца непрацаздольныя людзі, што не маюць жылля або апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Патранат ажыццяўляе ўсё той жа тэрытарыяльны цэнтр, сельвыканкам. Ёсць яшчэ прыёмная, гасцявая і патранатная сем'і, пра якія мы нямала пісалі. Ствараюцца і дамы самастойнага сумеснага знаходжання.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■

**Сёлета ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі пачала дзейнічаць інфалінія, якая даступна на тэрыторыі ўсёй краіны. Для таго, каб атрымаць даведачную інфармацыю і кансультацыі спецыялістаў міністэрства, трэба тэлефанаваць па нумары 8-(017)-309-9-309 з 9.00 да 10.30 у будныя дні.**

• Карысна ведаць

### Які парадак залічэння на сацыяльнае абслугоўванне на даму?

Для залічэння на сацыяльнае абслугоўванне на даму неабходна пісьмова звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы фактычнага пражывання. Пры гэтым варта прад'явіць дакумент, які сведчыць асобу; дакумент устаноўленага ўзору аб праве на льготы; медыцынскую даведку аб стане здароўя.

Работнікі цэнтра на працягу трох рабочых дзён з дня звароту правядуць абследаванне матэрыяльна-бытавога становішча пажылога чалавека і складуць акт гэтага абследавання. Таксама яны запытаюць у дзяржорганаў і іншых арганізацый звесткі аб памеры атрымвай пенсіі за месяц, папярэдні месяцу звароту; даведку аб месцы жыхарства і складзе сям'і; звесткі аб тым, што пажылога чалавека, які звярнуўся па аказанне сацыяльных паслуг, не даглядае асоба, якая атрымлівае дапамогу па доглядзе інваліда 1 групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Рашэнне аб заключэнні дагавора аказання сацыяльных паслуг прымаецца на працягу пяці рабочых дзён пасля атрымання гэтых звестак.

■ Добрая навіна

# «АСЕННІЯ ЗАПЛЫВЫ» Ў АБНОЎЛЕНЫМ БАСЕЙНЕ

**Традыцыйныя спаборніцтвы «Асеннія заплывы» адбыліся ў Клецку, што на Міншчыне. Знамянальна, што яны прайшлі ў капітальна адрамантаваным басейне фізкультурна-аздараўленчага цэнтра.**

На прывядзенне басейна ў бездакорны стан затрачана больш як 1,3 млрд рублёў. Большасць сродкаў выдаткавана з абласнога бюджэту. На аб'екце заменена каналізацыйная сістэма, дзверы, плітка, столь, а таксама добраўпарадкаваны санітарныя вузлы і душавыя пакоі, адрамантаваны гардэроб. Зусім іншы выгляд набыў і непасрэдна сам басейн: новая абліцоўка, сістэма пераліванія вады.

Рэканструкцыю комплексу плануецца прадоўжыць. На чарзе — добраўпарадкаванне першага паверха будынка, адміністрацыйныя пакоі і спартыўный залы.

А 7 лістапада адбудзецца адкрыццё фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Стоўбцах. Налета такі цэнтр з'явіцца ў Валожынскім раёне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■

**Дзеля таго, каб культурнае жыццё ва ўсіх яго праявах было ўласціва не толькі сталіцы, але актывізавалася ў іншых гарадах краіны, у пэўны момант Міністэрствам культуры было вырашана распачаць акцыю па штогадовым наданні аднаму з беларускіх гарадоў статусу культурнай сталіцы.**

**21 студзеня 2010 года гонар называцца культурнай сталіцай атрымаў багаты на сваю гісторыю горад на Дзвіне Полацк. Ён змяніў на гэтым пасту Віцебск, які да тых часоў насіў гэтае званне. На працягу года горад з адпаведным статусам прымае ў сябе прафесійныя калектывы, арганізуе культурныя мерапрыемствы, робіць ухіл на развіццё мастацтва і прыцягненне публікі да праграм, якія прапануюцца, — і ва ўсім гэтым дэманструе сваю самабытнасць, унікальнасць, выключнасць.**

**Пасля надання Полацку статусу культурнай сталіцы акцыя, што вызначае чарговага носьбіта гэтага звання, праходзіць штогод. Гарады Гомель, Нясвіж, Магілёў, Гродна і Брэст у храналагічным парадку ўжо станавіліся цэнтрамі культурнага жыцця.**

**Культурная сталіца гэтага года — горад Брэст — стаў пераемнікам праекта як месца, дзе знаходзіцца сімвал мужнасці падчас Вялікай Айчыннай вайны — Брэсцкая крэпасць, а гэта было важна адзначыць у год святкавання 70-годдзя Перамогі.**

**Сёлета на калегіі Міністэрства культуры рашэнне па чарговым выбранніку вагалася паміж Слуцкам і Маладзечна, у выніку цэнтрам культурнага жыцця краіны налета стане радзіма фестывалю беларускай песні і паэзіі.**

# І НАВАТ ТРАЛЕЙБУС СТАЎ ПАЭТЫЧНЫМ

**Гэты год стаў для Брэста асаблівым, горад над Бугам жыве ў статусе культурнай сталіцы краіны. Яшчэ ў студзені ў інтэрнэце з'явіўся сайт пад назвай «Брэст — культурная сталіца Беларусі» і, што цікава, адразу набраў папулярнасць. Для 300-тысячнага горада 800 праглядаў за дзень тэматычнага партала, згадзіцеся, — паказчык вельмі нядрэнны. З адным з адміністратараў сайта, дырэктарам Брэсцкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, дэпутатам абласнога Савета Святланай СЯМАШКАЙ *(на фота)* мы згадваем некаторыя знакавыя падзеі гэтага года.**



— На пачатку студзеня, на закрыцці міжнароднага фестывалю класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары», старшыня гарвыканкама Аляксандр Рагачук атрымаў сімвалічныя знакі, якія сталі пацверджаннем статусу горада як культурнай сталіцы. Вось гэтыя мерапрыемствы, а таксама іншыя, накшталт конкурсу юных піяністаў, сталі першымі паведамленнямі новага сайта, які стварыла гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна. Мы паставілі задачу акумуляваць на сваім электронным рэсурсе ўсе асноўныя падзеі культурнага напрамку. Кажу «асноўныя», бо паведаміць пра ўсе альбо большасць немагчыма, іх праходзіць вялікае мноства. А вось на асноўных мы завостраем увагу сваіх наведвальнікаў. Стараемся даваць не толькі інфармацыю, але і падмацоўваць яе добрай ілюстрацыяй. І людзі цікавяцца, пакідаюць свае водгукі, каментарыі, часам з канструктыўнымі ідэямі або прапановамі, — расказвае Святлана Мікалаеўна. — Адметнасцю нашага сайта, у пэўным сэнсе яго славутасцю стаў блог, які вядзе кіраўнік нашага горада Аляксандр Рагачук. На сваёй старонцы мэр разважае пра культуру ў цэлым: музыку, літаратуру, тэатры, музеі; а таксама пра культурнае развіццё гарадоў і народаў у гістарычным кантэксце; яшчэ пра культуру як неад'емную частку чалавечых адносін, пра культуру як выхавальніцу кожнага індывідуума.

У сваіх допісах Аляксандр Рагачук выказвае стаўленне да гарадскіх падзей і мерапрыемстваў, а таксама да людзей, якія вызначыліся на ніве культуры ці ў іншых галінах гарадскога жыцця. І гэта важна. Сёння далёка не кожны кіраўнік такога рангу кантактуе з гараджанамі ў сацыяльных сетках. Тым больш па пытаннях культуры.

А падзей — цікавых, змястоўных, павучальных, відовішчных — за гэты год было столькі, што пра ўсе не раскажаш, а вылучыць галоўныя з іх не так і проста. Ну, напрыклад, адкрыццё гістарычнага тралейбуса. Ён і цяпер ходзіць па гарадскіх маршрутах, я часам пад'язджаю на ім некалькі прыпынкаў. І хоць ужо добра ведаю тэкст, які гучыць падчас руху, але мне цікава зноў і зноў разглядаць інфармацыйныя стэнды з датамі і апісаннем асноўных падзей амаль 1000-гадовай гісторыі Брэста. Заўважаю, што іншыя пасажыры таксама чытаюць.

Не менш змястоўным аказаўся праект нашай бібліятэкі «Рыфмы Перамогі», які яшчэ называлі «паэтычны тралейбус». Вы здагадаліся, напэўна: у тралейбусе гучалі вершы. Ва ўмовах студыі мы запісалі творы пра вайну. Іх чыталі вядомыя ў горадзе людзі. І хоць чытальнікамі сталі непрафесіяналы, у дэкламацыю ваеннай паэзіі яны, несумненна, уклалі душу. Напрыклад, кіраўнік паштовага ведамства Валянціна Пух выбрала верш «Мой дзед не вярнуўся з вайны» невыпадкова: яе родны дзед загінуў на фронце. Таму і выкананне стала такім пранікнёным.

**Сёння далёка не кожны кіраўнік такога рангу кантактуе з гараджанамі ў сацыяльных сетках. Тым больш па пытаннях культуры.**

Запомніўся незвычайнасцю сцэнарыя, мноствам падзей сёлетні Дзень горада. На свяце аддалі даніну гісторыі: была выраблена сімвалічная манета ў гонар 350-годдзя Брэсцкага манетнага двара. Шмат эмоцый падарыў гледачам форум вулічных тэатраў. А яшчэ гэтым разам прайшоў карнавал, які пакінуў незабыўныя ўражанні. Казалі, што традыцыю карнавалаў у горадзе маюць намер працягнуць, было б вельмі добра.

І яшчэ вельмі хочацца спадзявацца, што гараджане зробяць рэальныя крокі на шляху працягу традыцыі вяртання культурных каштоўнасцяў у Брэст. Як гэта важна, мы адчулі падчас імпрэзы ў Музеі гісторыі горада. Заўважу, наш Брэст мае багатую, але, на жаль, у многім трагічную гісторыю. І ад славутага некалі старадаўняга Берасця, з яго палацамі і храмамі, багатымі асабістымі бібліятэкамі, засталося вельмі мала. Па сутнасці, крупінкі. Таму, калі ў горад вяртаецца нешта з былых часоў, з'яўляецца духоўная повязь пакаленняў. Падобныя думкі выказвалі ўдзельнікі мерапрыемства, прысвечанага перадачы музею карцін ураджэнца Брэст-Літоўска, мастака Парыжскай школы Якава Балглея. Работы ў дар музею перадаў ганаровы консул Францыі ў Брэсце Леанід Стаецкі. Ён набыў іх, дарэчы, за свае грошы.

Наступны крок на гэтым шляху — набыццё поўнага асобніка Брэсцкай Бібліі. Гісторыя гэтай кнігі тоіць у сабе нямала загадак. Ёсць звесткі, што пасля смерці Мікалая Радзівіла Чорнага яго сын загадаў спаліць усе выданні Брэсцкай друкарні. Некаторыя фаліянты ўсё ж захаваліся, іх у свеце налічваецца некалькі дзясяткаў. Таму цалкам верагодна набыць кнігу ў аднаго з калекцыянераў.

Пра гэта, дарэчы, у сваім блогу піша старшыня гарвыканкама. Мэр заклікае ўсіх неабыякавых гараджан прыняць удзел у фінансаванні праекта. Вяртанне на радзіму Брэсцкай Біблії стане для ўсіх нас асаблівай, знакавай падзеяй. Бо менавіта ў духоўнай спадчыне хаваюцца карані таго, што можна назваць падмуркам зместу сённяшняй культурнай сталіцы. Знаходзячыся побач з такімі рарытэтамі, можна ўсвядоміць, што ўсё на гэтым свеце праходзіць і толькі культурныя каштоўнасці застаюцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Падзея

# УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У... СТАЛІЦУ



**На днях стала вядома, што Маладзечна выбрана культурнай сталіцай Беларусі 2016 года. Што значыць гэтая падзея для жыхароў горада і ў цэлым Міншчыны, да чаго абавязвае, што новага будзе прапанавана гледачу? Пра гэта і іншае расказалі першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Святлана БАРАНОК і дырэктар Палаца культуры г. Маладзечна, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Святлана САРОКА.**

**Святлана БАРАНОК:**

— Мінская вобласць прадставіла на саісканне гэтага звання два гарады — Слуцк, які ў наступным годзе адзначае 900-годдзе, і Маладзечна, якое ўжо трэці раз хадайнічае аб яго прысваенні. Маладзечна, можна з упэўненасцю сказаць, з'яўляецца некаранаванай культурнай сталіцай Міншчыны. У горадзе працуюць установы культуры абласнога падпарадкавання: Мінскі абласны драматычны тэатр, абласны тэатр лялек «Батлейка», абласны краязнаўчы музей, Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К. Агінскага. У раёне функцыянуюць філіялы дзяржаўных рэспубліканскіх музеяў: Янкі Купалы (вёскі Яхімоўшчына і Вязынка), Максіма Багдановіча (вёска Ракуцёўшчына). Акрамя таго, архітэктура, інфраструктура Маладзечна найлепшым чынам спрыяе таму, каб ён стаў культурнай сталіцай Беларусі. Бясспрэчна, гэта — важная падзея ў жыцці вобласці. Мы разлічваем, што, акрамя тых мерапрыемстваў у сферы культуры, якія праводзяцца на Маладзечаншчыне, пачэснае званне надасць новы імпульс для творчых сувязяў, абменаў, гастроляў прафесійных калектываў. Думаю, што сумесныя праекты з Міністэрствам культуры дазволяць яшчэ больш пашырыць межы культурнага супрацоўніцтва.

**Святлана САРОКА:**

— Кожны год на маладзечанскай зямлі рэалізуюцца значныя культурныя праекты. Не стане выключэннем і наступны. На працягу яго пройдзе цыкл мерапрыемстваў «Майстры мастацтваў — культурнай сталіцы Маладзечна»: канцэртныя праграмы вядучых творчых калектываў і выканаўцаў, выставачныя экспазіцыі вядомых мастакоў, спектаклі, сустрэчы з прызнанымі майстрамі мастацтваў Беларусі, краін блізкага і далёкага замежжа. Гэта дапаможа прадоўжыць і ўмацаваць творчыя сувязі з гарадамі-пабрацімамі Маладзечаншчыны. Не кожны рэгіён можа пахваліцца такой колькасцю «братоў». А ў Маладзечанскага раёна іх 21 — з Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны, Балгарыі.

Знакавым стане і правядзенне XVI Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Сёлета ён асаблівы — прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння народнага артыста СССР, усімі любімага песняра Уладзіміра Мулявіна.

На рахунку заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь сімфанічнага аркестра Маладзечанскага музычнага каледжа імя М.К. Агінскага і Маладзечанскага маладзёжнага народнага тэатра нямала творчых праектаў: пастаноўкі опер, канцэртныя праграмы не толькі ў Беларусі, але і ў Францыі, Эстоніі, Польшчы, Літве. На працягу двух апошніх гадоў з поспехам прайшлі канцэрты ў межах сумеснага тэлевізійнага праекта музычнага каледжа, Палаца культуры і Белтэлерадыёкампаніі «Навагоднія вечары ў Маладзечне», «Маладзечна запрашае». У наступным годзе плануецца працяг гэтага цудоўнага пачынання: аматараў класічнай, джазавай, сучаснай музыкі чакаюць незабыўныя сустрэчы. У міжнародным творчым праекце «Маладзечанцы — роднаму гораду» прымуць удзел выпускнікі музычнага каледжа, а цяпер — вядучыя салісты оперных тэатраў свету. У межах форуму адбудуцца творчыя вечары вядомых землякоў: заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі кампазітара Алега Елісеенкава, паэтаў Леаніда Путырскага і Кастуся Цыбульскага.

2016 год па традыцыі стане сталіцай танцавальнага дзейства — міжнароднага турніру па спартыўных бальных танцах «Кубак Маладзечна», падчас якога выступяць найлепшыя танцавальныя пары больш як з 11 краін свету.

Асаблівая падзея для моладзі — фестываль творчых ініцыятыў «Час жыць!», які набыў ужо папулярнасць. Ён дазваляе не толькі выявіць таленты, але і прыцягнуць сацыяльна неўладкаваных маладых людзей да актыўнага творчага жыцця і валанцёрскай дзейнасці.

Упершыню ў 2016-м адбудзецца творчы конкурс «Сімвал маладога пакалення», фестываль пясочнай анімацыі SandArt, таксама пройдзе ўручэнне штогадовай маладзёжнай прэміі «Рэспект года». Патрыятычнаму і маральнаму выхаванню будзе садзейнічаць маладзёжны праваслаўны баль «Грамніцы-2016», адкрыты конкурс харавых і вакальных калектываў духоўнай музыкі «Музыка душы маёй».

Не застанецца без увагі і старэйшае пакаленне. Фестываль «Звіні, наша песня, пераможным салютам», свята «Асенні настрой», адкрыты конкурс «Мы шукаем таленты» збярэ найлепшыя ветэранскія калектывы і выканаўцаў пажылога ўзросту.

Важная ўмова для нас — арганізацыя канцэртна-гастрольных праектаў. Гледачоў парадуюць міжнародны фестываль «Рок-каранацыя», канцэртныя праграмы вядучых выканаўцаў і калектываў беларускай і расійскай эстрады: Аляксандра Разанбаума, Дзмітрыя Калдуна, Міхаіла Шуфуцінскага, Глеба Матвейчука і іншых.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Асоба

# АКРЫЛЕНЫ РАДЗІМАЙ І МУЗЫКАЙ

## Рыгор Сарока — пра творчы пошук, славутага земляка і месца кожнага ў жыцці

**Дырэктара Маладзечанскага каледжа імя М.К. Агінскага Рыгора Сароку добра ведаюць не толькі ў Беларусі. Для яго адкрыты найлепшыя канцэртныя залы Еўропы, свету. Рыгор Сямёнавіч мог бы з'ехаць за мяжу. За гонар прыняць яго лічаць шмат якія краіны. Але, як прызнаўся сам маэстра, ён патрыёт сваёй краіны, аддана служыць роднай Маладзечанскай зямлі, Міншчыне. У яго нават думкі не ўзнікала пакінуць Бацькаўшчыну. Ён у штодзённым творчым пошуку, паспявае ўсё: кіраваць музычнай установай, маладзёжным музычным тэатрам, сімфанічным аркестрам, дабрачынным фондам «Леў», які дапамагае хворым дзецям, дабрачынным мясцовым фондам «Спадчына М.К. Агінскага». Знаёмыя, сябры жартуюць, што Рыгор Сямёнавіч бяжыць нават не наперадзе паравоза, а наперадзе самалёта.**



***— У музычным каледжы імя М.К. Агінскага, які вы ўзначальваеце, ужо больш як трыццаць гадоў паспяхова працуе сімфанічны аркестр. Такога кшталту калектываў адзінкі ў навучальных установах Беларусі. Што вас падштурхнула да яго стварэння?***

— Перш чым яго стварыць, я прайшоў службу ў арміі, служыў у ракетных войсках ва Украіне, дзе кіраваў духавым аркестрам, пісаў для яго музыку. Пасля дэмабілізацыі прадоўжыў вучобу ў музычным каледжы, адкуль забралі на службу з другога курса. Спачатку я стварыў тут аркестр баяністаў, потым выкладчыцкі аркестр рускіх народных інструментаў, якім кіраваў 19 гадоў і які аб'ездзіў шмат еўрапейскіх краін. Але праз некаторы час адчуў, што перарос гэтую музыку. Так і прыйшоў да сімфанічнага аркестра, да вяршыні калектыўнага музіцыравання. Вышэй за яго няма, бо чалавецтва яшчэ нічога лепшага не прыдумала. Гэта калектыў, якому пад сілу ўсё. Джаз, класіка, сімфонія, песня, акампанемент, опера — калі ласка. За 36 гадоў з дня заснавання аркестра толькі ў адной Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбылося каля 30 маіх канцэртаў. Шмат выступалі ў вялікіх канцэртных залах Эстоніі, Літвы, Польшчы, Расіі, Галандыі, Францыі, Германіі, Чэхіі і іншых.

Дзякуючы сімфанічнаму аркестру, я здзейсніў яшчэ адну сваю мару — маладзёжны музычны тэатр, які «замахнуўся» на пастаноўку оперных спектакляў. Падкрэслю, гэта не студэнцкія капуснікі, а паўнавартасныя оперныя спектаклі з неверагоднымі дэкарацыямі, гістарычнымі касцюмамі: «Іаланта», «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага, «Травіята» Дж. Вердзі, «Кармэн» Ж. Бізэ і іншыя.

**У дзяцінстве я мог слухаць оперы бясконца. На той час беларускае радыё было для мяне сапраўднай крыніцай, адкуль пастаянна гучалі тэатральныя пастаноўкі, класічная музыка.**

***— Вам належыць ідэя стварэння опернага спектакля «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт» на беларускай мове, які з поспехам дэбютаваў у Маладзечне. І цяпер пачалося, так бы мовіць, яго трыумфальнае шэсце па гарадах Беларусі...***

— Па маім заказе музыку напісаў кампазітар Алег Залётнеў. Аўтарам лібрэта і рэжысёрам-пастаноўшчыкам выступіў Сяргей Макарэй. Над танцавальнай часткай працаваў Аляксандр Драгаміраў. Хормайстар — Вера Каханоўская. А галоўную ролю князя Міхала Агінскага выканаў наш выпускнік, а цяпер саліст фларэнтыйскага тэатра «Камунале» Уладзімір Александровіч. Гэтую оперу, дарэчы, было нялёгка ствараць, бо адсутнічаў літаратурны тэкст. Меліся толькі гістарычныя звесткі, але мастацкага твора не было. Усё нараджалася, так бы мовіць, у творчых пакутах. Але ў нас атрымалася добрая рэч. Гэтая опера некалькі разоў гучала ў Маладзечне, у Брэсце, запісана Беларускім тэлебачаннем і цяпер «пайшла» па ўсёй Беларусі. Мы атрымліваем шмат водгукаў ад простых гледачоў. Вельмі станоўча ўспрыняло спектакль музычнае грамадства. Напрыклад, газета «Брэсцкі кур'ер» напісала, што такога маштабнага опернага відовішча горад над Бугам не бачыў сто гадоў. На 3 снежня нас запрасіў Віцебск, дзе опера прагучыць у найлепшай гарадской канцэртнай зале.

***— Рыгор Сямёнавіч, вы шмат увагі надаяце творчасці Міхала Клеафаса Агінскага. Чаму менавіта да гэтай тэматыкі найчасцей звяртаецеся?***

— Сапраўды, 20 гадоў свайго жыцця я прысвяціў Міхалу Клеафасу Агінскаму. Пачынаючы з прысваення музычнаму каледжу імя вялікага кампазітара, што ў тыя часы было нялёгка здзейсніць. Потым была мемарыяльная дошка знакамітаму земляку ў Фларэнцыі на доме, дзе ён жыў, а таксама — на сценах музычнага каледжа ў Маладзечне, помнік у гонар знакамітага земляка. А цяпер вось і опера...

Агінскія многа зрабілі для Беларусі, Польшчы, Літвы і заслугоўваюць падзякі. Яны шмат пабудавалі на гэтых землях замкаў, храмаў. Напрыклад, вёска Лучаі на Віцебшчыне — які касцёл тут узведзены іх родам! Петрапаўлаўская царква ў Мінску — справа рук Агінскіх. У Залессі на Смаргоншчыне, у вёсцы Абарок, што ў нашым раёне, — таксама пакінулі свой след Агінскія. У прыватнасці, дзядзька Міхала будаваў тут драўляны касцёл Святога Роха, які, на жаль, не захаваўся. Да нядаўняга часу гэтае знакавае месца зарастала пустазеллем, было засмечаным. Дзякуючы валанцёрам мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага», маладзечанскай уладзе, неабыякавым людзям, тут наведзены парадак. Адрэстаўраваны склеп, дзе былі пахаваны прадстаўнікі сям'і Ходзькаў-Дадэркаў. Анёла на помніку зрабіў выкладчык нашага каледжа Андрэй Гамолка.

Ва ўстанове створаны пакой Агінскага, дзе збіраюцца розныя матэрыялы, дакументы, прэзенты, што тычацца яго жыцця і творчасці, газеты, часопісы, артыкулы, дзе гаворыцца пра знакамітага кампазітара. Звычайна, людзі ведаюць толькі адзін паланэз Агінскага «Развітанне з Радзімай». Але ён напісаў іх 24. Наш калектыў аркеструе сем паланэзаў, менавіта тыя, што падыходзяць для сімфанічнага аркестра.

***— Рыгор Сямёнавіч, многія вашы выпускнікі заваявалі сусветную вядомасць, выступаюць у прэстыжных залах. Што, на ваш погляд, дало ім пуцёўку на вялікую сцэну?***

— Так, нашы выпускнікі выступаюць па ўсім свеце. Асаблівую ролю ў станаўленні іх адыграла опера. Возьмем, напрыклад, «Іаланту» — першую пастаўленую намі оперу. Саліст Павел Валужын спявае ў Вялікім тэатры ў Маскве, Анатоль Сіўко — у Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі, прывёз першую прэмію з Германіі, другую прэмію — з Барселоны. Выдатны тэнар Андрэй Мацюшонак — студэнт Беларускай акадэміі музыкі, Уладзімір Дзмітрук выступае ў Метраполітан-опера ў Нью-Ёрку.

**20 гадоў свайго жыцця я прысвяціў Міхалу Клеафасу Агінскаму. Пачынаючы з прысваення музычнаму каледжу імя вялікага кампазітара, што ў тыя часы было нялёгка здзейсніць.**

***— Якія планы ў маэстра ў найбліжэйшай перспектыве?***

— Напланавана пяць творчых вечароў з удзелам аднаго з «песняроў» — Анатоля Кашапарава, тэатра Музычнай камедыі, рок-ансамбляў. Гэты праект ладзім разам з Сяргеем Любавіным і нашым сімфанічным аркестрам. У наступным годзе ў знакамітага саліста «Масканцэрта» Валянціна Сухадольца юбілей. Ён родам з Валожына, наш выпускнік. Таму мерапрыемствы, прысвечаныя яго творчасці, правядзём як на яго радзіме, так і ў Маладзечне, Мінску. Пасля — нас з аркестрам запрасілі выступіць у Санкт-Пецярбургу, Эстоніі, дзе на востраве Саарэмаа пройдзе арганны фестываль. Нядаўна мы выступілі ў канцэртнай зале «Эстонія» з салісткамі Метраполітан-опера Шэлі Джэксан і Цюрыхскага тэатра Дарай Савінай. І вельмі ўдала выканалі фінал сімфоніі сучаснага эстонскага кампазітара Торыма. Ён быў уражаны. І прапанаваў нам цалкам сыграць гэты твор на арганным фестывалі.

***— Здзіўляе, як вы ўсё паспяваеце ў прафесійнай і грамадскай дзейнасці? Акрамя таго, мяркую, трэба надаць увагу сям'і, дзецям, унукам.***

— Я чалавек актыўны, па гараскопе Стралец, устаю рана, раблю зарадку, іду пешшу на працу. Там гавару мала, коратка, канкрэтна даю заданні, распараджэнні. Таму і паспяваю многае. Мая жонка стварыла дома такі шыкоўны фундамент, цёплую хатнюю атмасферу, якія спрыяюць паразуменню, творчасці. Таму час ёсць на ўсё: і спяваць, і кантактаваць, і выхоўваць маладое пакаленне. У нас тры дачкі, чатыры ўнукі. Самаму маленькаму Яраславу яшчэ і месяца няма.

***— І ўсё ж, Рыгор Сямёнавіч, што прывяло вас да музыкі? Адкуль такая пяшчота да яе, як да жывой істоты?***

**11.25 «Канстанцін Заслонаў». Кінааповесць.**
**12.45** «Камертон». Пісьменнік Алесь Савіцкі.
**13.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.55 «Рыбная крама «Ямаха». Драма.**
**15.30 «Сямёра адважных». Камедыя.**
**17.15 «Чырвоная палатка». Драма.**
**19.45** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Савецкі космас: чатыры каралі». Дак. фільм
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Дазвольце расказаць!» Спявачка Ляля Размахава.
**21.15 «Чалавек на каленях». Драма.**
**23.05** «Бард-парад».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.35, 23.10** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Тэніс. Выніковы турнір ВТА. Сінгапур. Паўфінал.
**9.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**10.25** Піт-стоп.
**10.55** Фактар сілы.
**11.20** Баскетбол. НБА. Таронта — Нью-Арлеан.
**12.55** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Астана» — «Цмокі-Мінск».
**14.50** Хакей. Белнафтахім — Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Нёман» (Гродна).
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Масква).
**19.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Вайводзіна» (Сербія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**21.40** Самба. Чэмпіянат свету.
**23.20** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/ф «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** «Людміла Гурчанка. У бляску адзіноты».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** Рэаліці-шоу «Аўтобус».
**13.25 Меладрама «Вакзал для дваіх».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20 Камедыя «Юбілей».**
**18.30** «ДОстояние РЕспублики: Людмила Гурченко».
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35 Драма «Багіня. Як я пакахала».**
**0.20 Трылер «Паслязаўтра».**

### СТБ

**6.20** 1/2 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ.
**7.50** «Анфас».
**8.05** «Тайны свету».
**9.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**10.00** «Іншая краіна». «Там, дзе Еўропа сустракаецца з AZіяй».
**10.40** «Мінск і мінчане».
**11.15 «Салдаты 6». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.20 Маст. фільм «Антоніа Вівальдзі, прынц Венецыі».**
**15.30** «Вядзіць па-руску».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.25 Маст. фільм «Салодкі ліслапад».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Трылер «Задыяк».**
**22.50** «Дакументальны праект»: «Вялікія тайны космасу».

### МІР

**6.00** М/ф.
**6.10, 1.45 Маст. фільм «Змеялоў».**
**8.00** «Саюзнікі».
**8.30** «Культурныя сталіцы СНД».
**9.00** «Ой, мамачкі!»
**9.30, 5.25** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.45 Маст. фільм «Вакзал для дваіх».**



**13.40 Маст. фільм «Спытай у пылу».**
**16.15 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**18.25 Серыял «Скліфасоўскі 3».**
**0.30** «Культпрасвет».
**1.15** «Дыяспары».
**3.35 Маст. фільм «Цырк».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Далей каханне».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.00** «Гэта мая мама».
**12.50, 14.15 Маст. фільм «Па звестках крымінальнага вышуку».**
**14.35 Маст. фільм «Родны чалавек».**
**16.20** «Дзве жонкі».
**17.10 Маст. фільм «Васількі для Васілісы».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Галоўная сцэна».
**23.10 Маст. фільм «Мезальянс».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худзею!»
**14.15** «Ежа жывая і мёртвая».
«Вада».
**15.05, 16.20 Серыял «Час Волкава».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.55** «Ты не паверыш!»
**21.55** «50 адценняў. Бялова».
**22.55** «Час Г».
**23.30 Маст. фільм «Сваяк».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 15.30, 19.00, 20.55, 23.45** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.25 Серыял «Дэманы Да Вінчы».**
**10.25, 11.45, 15.55, 17.15** «Хатняя крама».
**10.40** «Хобі+TV».
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**12.00 Трылер «Паляўнічыя на гангстараў».**
**13.45 Драма «Полымя страсці».**
**15.35** «Мультпарад».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак.
**16.25 Серыял «Альф».**
**17.25 Камедыя «Не бядуй».**
**19.05 Трылер «Аварыя».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.10 Фантастыка «Цёмны бок месяца».**

## ■ Кінагід

### «САМАЙ АБАЯЛЬНАЙ...» — 30 ГАДОЎ

**10 лістапада споўніцца роўна 30 гадоў, як у кінатэатрах СССР адбылася прэм'ера мастацкага фільма «Самая абаяльная і прывабная». У 1985-м гэтая камедыя стала лідарам кінапракату — яе пагледзелі без малога 45 мільёнаў гледачоў у Савецкім Саюзе, а таксама набылі для паказу 69 краін свету. Напярэдадні круглай даты прапануем узгадаць колькі цікавых фактаў з «біяграфіі» юбіляра.**



У ролі сціплай «шэрай мышкі», інжынера Надзі Клюевай, рэжысёр Геральд Бежанаў да самага пачатку бачыў менавіта Ірыну Мураўёву. Актрыса ж, у сваю чаргу, імкнулася выйсці за межы навязанага ёй амплуа мілай, але непрыгожай жанчыны і катэгарычна адмаўлялася здымацца ў фільме — пачатковец вялікага кіно Бежанаў паўгода хадзіў у тэатр імя Массавета на ўсе яе спектаклі, пільнаваў Мураўёву пасля рэпетыцый, спрабаваў схіліць на свой бок яе мужа, рэжысёра Леаніда Эйдліна... І нейкім чынам усё ж пераканаў. Пра што, як часта прызнаваўся, не шкадаваў ніводнага імгнення: «Адно задавальненне было працаваць з Мураўёвай на здымачнай пляцоўцы: вельмі засяроджаная, адказная, прафесійная актрыса».

На ролю сяброўкі галоўнай гераіні, псіхолага Сусанны, разглядаліся некалькі прэтэндэнтак. Мантру «я самая абаяльная і прывабная...» маглі данесці з экрана да савецкіх жанчын Любоў Палішчук або Іна Чурыкава. І, мабыць, адзін з гэтых варыянтаў мог стаць найлепшым, бо Таццяна Васільева, якая ў выніку і ўвасобіла вобраз Сусанны, даводзіла рэжысёра ледзь не да інфаркту. У адзін цудоўны дзень актрыса пафарбавала валасы ў чырвоны колер і адмовілася «вяртаць, як было» — з гэтага моманту яе гераіня з'яўлялася ў кадры выключна ў каптурку. Папіў крыві рэжысёра і Аляксандр Абдулаў, які пасярод здымак раптоўна на два тыдні з'ехаў з Масквы для ўдзелу ў іншым праекце.

Забаўна, але ні Ірына Мураўёва, ні Уладзімір Носік не ўмелі гуляць у пінг-понг, які, паводле сцэнарыя, звёў галоўную гераіню з яе сапраўдным шчасцем. Давялося абаім перад здымкамі спецыяльна трэніравацца, прычым Носік падышоў да пытання з такім імпэтам, што нават зламаў палец на назе.

Пакутніцкі выраз твару Міхаіла Какшэнава, якога калегі ўзмоцнена паілі газаванай вадой з аўтамата «для супрацоўнікаў інстытута», тлумачыцца не толькі бліскучай гульнёй акцёра. Насамрэч, гэтая сцэна здымалася добры дзясятак дубляў: так партнёры па фільме пажартавалі з акцёра. «Пі, Лёха, пі!» — з сур'ёзнымі тварамі падбухторвалі яны, і гэтая рэпліка ўвайшла ў фільм.

А за бяскрыўдны, здавалася б, жарт «Яна што, з Урала?» рэжысёру давялося пісаць тлумачальны ліст і выбачацца асабіста перад абураным Барысам Ельцыным, тады кіраўніком Свярдлоўскага абкама, а ў будучыні прэзідэнтам Расіі.

**Крылатыя фразы з фільма**

*«Штосьці вы ўсё печаце дзяўчаты, печаце! Лепш бы ўжо капусту квасілі, ці што...»*

*«Мне не зразумела, якія наступствы могуць выцекчы з кубачка кавы...»*

*«Глядзі-ка, у джынсы ўжо апрануліся нават самыя адсталыя слаі насельніцтва».*

*«Некаторыя ўсё замуж выходзяць і выходзяць, усё разлічваюць і разлічваюць!»*

*«Заначаваў у сябра... у доме калгасніка... Не паспеў пераапрануцца».*

*«Першы раз бачу дрэсіроўчыкаў, у якіх няма ананасаў».* ■

### ВТБ

**6.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.00, 4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Фэнтэзі «Забароненае царства».
**14.00, 22.50** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Вялікая маленькая зорка».
**15.30** Кулінарнае шоу «Майстаршэф. Дзеці».
**16.30** «Уральскія пельмені».
**18.00** Серыял «Кухня 5».
**20.30** Баявік «Рэд».
**23.30** «Дзікія гульні».
**0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**3.30** «Лаві момант».
**5.00** Серыял «Свацці».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Белае, чырвонае і...» Маст. фільм.
**12.10** «Ёган Вольфганг Гётэ». Дак. фільм.
**12.15** Да 80-годдзя з дня нараджэння актрысы. Вялікая сям'я. Людміле Гурчанка прысвячаецца.
**13.10** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**13.40** Рудольф Бухбіндзер, Зубін Мета і Венскі філарманічны аркестр у канцэрце «Летнім вечарам у палацы Шонбрун».
**15.15** «Выпадак на шахце восем». Маст. фільм.
**16.45, 2.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Рамантыка раманса». Незабыўныя мелодыі.
**18.25** Да 80-годдзя з дня нараджэння Людмілы Гурчанкі. «Старыя сцэны». Маст. фільм.
**20.00** Выдатныя пісьменнікі Расіі. Андрэй Вазнясенскі. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна». 1976 год.
**21.30** «Белая студыя». Канстанцін Райкін.
**22.20** «Карабель Тэсея». Маст. фільм.
**0.45** «Трапічны лес. Паўднёвая Амерыка». Дак. фільм.
**1.40** «Беззаконне». «Казка пра дурнога мужа». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Золата старажытнай багіні».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Алег Анофрыеў. 2008 год.
**7.05** Маст. фільм «Доўгія праводзіны».
**8.35, 9.40, 11.00, 13.00, 14.20, 15.40, 17.00, 19.00, 20.10, 23.00, 0.40, 2.25, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**8.45, 14.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1985.
**13.15** Маст. фільм «Крок з даху».
**16.00** «Колба часу».
**19.20** «Галіна Вішнеўская. Вяртанне». 1992 год.
**20.45** Дак. фільм «Я сшыю Вам сукенку».
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Маст. фільм «Формула вясёлкі».
**0.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**1.00** Маст. фільм «Іпадром».

### EUROSPORT

**5.00, 10.30, 11.45, 14.15, 19.15, 21.30, 3.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**5.45, 11.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**6.30** Байцоўскі клуб.
**7.30, 9.00, 16.00, 17.25** Футбол. Еўрагалы.
**7.35, 16.05** Футбол. Лаціна.
**8.00, 16.30** Футбол. ФІФА.
**8.30, 17.00** Футбол. Сусветны футбол.
**13.00** Футбол. Кубак Еўропы. (U-21.)
**17.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Лепшыя моманты.
**20.00, 21.25** «Перавага коней».
**20.05** Конны спорт. GLOBAL CHAMPIONS TOUR.
**22.15** Баявыя майстэрствы. Суперкомбат. Сусветная серыя Гран-пры. Фінал.
**23.00, 4.00** Баявыя майстэрствы. Кароль каралёў.
**1.00** Веласпорт. Гонка на трэку Revolution Series.

### КАМЕДЫЯ

**6.00** Камедыя «Псіхі на волі».
**7.40** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**9.10** Серыял «Пэт і Кэбедж».
**10.10** Камедыя «Дзікая штучка».
**11.55, 15.35, 0.50** Скетчком «Паміж намі».
**12.20** Камедыя «Як украсці дыямент».
**14.00** Камедыя «Штосьці падобнае на шчасце».
**16.00** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**17.35, 22.00** Серыял «Вялікая школа».
**18.40** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**20.15** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**23.10** Меладрама «Нявеста з таго свету».
**1.15** Меладрама «Каханне звыш тры гады».
**3.00** Серыял «Татуля».
**4.15** Меладрама «Даю год».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.20** «Дачныя гісторыі».
**11.10** «Сто пытанняў даросламу».
**12.00** «Ргокіно».
**12.10, 5.20** «Хронікі маскоўскага побыту».
**13.00** «Доказ віны».
**13.35, 0.40** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**17.20** М/ф «Воблачна, магчымы ападкі».
**18.40** «Лінія абароны».
**19.10** Маст. фільм «Час шчасця».
**21.10** Маст. фільм «88 хвілін».
**23.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.00** «Жывеш толькі двойчы». Дак. фільм.

### ТБ1000

**5.30** Баявік «Быць Флінам».
**7.20** Камедыя «Мадлен».
**8.55** Меладрама «А вось і Полі!».
**10.30. 2.20** Фэнтэзі «Гары Потэр і філасофскі камень».
**13.05** Драма «Магія слоў: Гісторыя Дж. К. Роўлінг».
**14.40** Драма «Дыяна: Гісторыя кахання».
**16.30** Камедыя «Хацеў бы я быць тут».
**18.20** Трылер «Без кампрамісаў».
**20.00** Драма «Джэры Магуаер».
**22.20** Драма «Джо».
**0.20** Трылер «Брудныя гульні».
**4.50** Драма «Валодаючы табо».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Падарунак з характарам».
**8.00** Меладрама «Андэрсан. Жыццё без кахання».
**10.30** М/ф «Вяртанне Бураціна».
**11.50** Драма «Танец Дэлі».
**13.25** Трагікамедыя «Бакенбарды».
**15.10** Меладрама «З 8 Сакавіка, мужчыны!».
**17.00** Драма «Браты Ч».
**18.40** Камедыя «Папа напракат».
**20.20** Баявік «Адваротны адлік».
**22.20** Камедыя «Вяселле па абмене».
**0.10** Меладрама «Марафон».
**2.00** Драма «9 дзён і адна раніца».
**3.30** М/ф «Бабай».
**4.50** Меладрама «Ваенна-палявы раман».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**6.50** Займальная навука.
**7.15, 8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Узлом Сістэмы.
**8.00** Зрабі або памры.
**9.20** Пагоня за леднікамі.
**10.10** Катастрофа ў рэальным часе.
**11.00** Навука будучыні Стывена Хокінга.
**11.50** Космас: Прастора і час.
**12.40** Эвакуацыя Зямлі.
**13.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.20** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**15.10** Сіла племені.
**16.00** Тайвань: востраў рыбы.
**16.50** Асветленая бездань.
**17.40** Погляд знутры.
**18.30, 19.20** Шырокі погляд.
**20.10** Найгоршае надвор'е ў гісторыі?
**21.00, 1.10, 5.15** Эвакуацыя Зямлі.
**21.50, 0.20** Паранармальнае.
**22.40, 2.50** Уварванне на Зямлю.
**2.00, 4.30** Найгоршае надвор'е ў гісторыі?

### DISCOVERY

**8.00, 15.15, 6.25** Махінатары.
**8.50** Мяцежнікі ледзянога возера.
**9.45** Смяротны ўлоў.
**10.40** Хлопцы з Юкана.
**11.35** Гаражнае золата.
**12.30, 0.00** Склады.
**13.25** Акулы аўтагаргоў з Даласа.
**14.20, 3.00** Хуткія і гучныя.
**16.10, 1.00, 5.35** Кубінскі хром.
**17.05, 4.50** Нябачныя светы.
**18.00, 4.00** Як уладкаваны Сусвет.
**19.00** Цуды Сусвету.
**20.00** Багажныя войны.
**23.00** Падарожжа ў невядомасць.
**2.00** Голыя і напалоханыя.
**7.13** Трой.

## 9 фактаў пра...

# СУМО

**Сумо — адзінаборства, родам з Японіі. Японцы захавалі традыцыі як самога паядынку, так і рытуалу падрыхтоўкі да яго. Для іх гэта не столькі спартыўнае адзінаборства, колькі баявое майстэрства, якое паказвае мужнасць і сілу. Хоць сумо займаюцца па ўсім свеце, паядынкі прафесіяналаў праводзяцца толькі ў Японіі.**



**1.** Сумо вельмі дынамічнае. Барцам трэба думаць хутка: за 10 секунд (стандартная працягласць паядынку) баец можа 2—3 разы змяніць тактыку. Між іншым, нягледзячы на вялікія габарыты і вагу, кожны прафесійны суматоры павінен умець садзіцца на шпагат.

**2.** Для перамогі трэба альбо выцесніць саперніка за межы круга, дахе (дыяметрам 4,55 м), альбо прымусіць дакрануцца да паверхні чым-небудзь, акрамя ступняў. Наогул, барцы дзеляцца на спецыялістаў па барацьбе ў поясе і па штуршках.

**3.** Сумо — вельмі траўманебяспечны від спорту. Стартавы кантакт — гэта сутыкненне двух у сярэднім 155-кілаграмовых асілкаў з хуткасцю каля 50—60 км/г.



**4.** Расповеды аб высокакаларыйнай ежы, якой аб'ядаюцца суматоры, — легенда. Іх асноўная ежа змяшчае 100—150 ккал, але проста ядуць яны ад пуза і пасля адразу спяць. Набраць вагу, неабходную для сумо, не так проста: для гэтага патрэбны адпаведны тып метабалізму.

**5.** Фарміраванне цела барца адбываецца выключна ў працэсе трэніровак за кошт павелічэння мышц і нарошчвання вагі. Гэтай мэце прысвечаны распарадак дня. Пад'ём з першымі промнямі сонца, нашча пачынаецца знясільваючая пяцігадзінная трэніроўка, якая патрабуе поўнай аддачы сіл і канцэнтрацыі.

**6.** У сумо забаронена біць інакш, чым адкрытай далонню, а таксама па вачах і ў вобласць геніталій. Забаронена хапаць за валасы, вушы, пальцы і частку, якая закрывае пах, — мавасі. Нельга праводзіць задушлівыя захопы. Усё іншае дазволена, таму ў арсенал барцоў уваходзяць аплявухі, штуршкі, захопы за любыя дазволеныя часткі цела і асаблівая паясы, а таксама кідкі, рознага кшталту падножкі і падсечкі.

**7.** Што тысячца даходаў сумаіста, у сярэднім у год ёкадзуна (найвышэйшая катэгорыя спартсменаў), калі браць пад увагу і іншыя заробкі, такія як рэклама, можа атрымаць заробак, роўны даходу футбаліста з сусветным імем.

**8.** Нягледзячы на ўзровень байца, яму катэгарычна забаронена самастойна вадзіць аўтамабіль. Калі суматоры, які парушыў правіла, будзе абвінавачаны ў гэтым, яму пагражае сур'ёзнае пакаранне. Таму звычайна яны ездзяць на таксі ці ж заказваюць для гэтага спецыяльныя мікрааўтобусы.

**9.** Валасы сумаіста збіраюцца ў адмысловы традыцыйны пучок на макушцы, у двух найвышэйшых дывізіёнах прычоска выконваецца значна больш складаная. Акрамя прыгажосці, яна валодае ўласцівасцю змякчаць удар па цемені, магчымы, напрыклад, пры падзенні ўніз галавой.

## НЯДЗЕЛЯ, 15 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.00 Меладрама «Рускае».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** Гісторыі рамонту.
**10.20** «50 рэцэптаў першага».
**11.05** XXL WOMAN TV.
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30 Меладрама «Жонка Шцірліца».**
**17.20 Меладрама «Знахарка».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Клуб рэдактараў.
**22.35** Навіны надвор'я.
**22.55 Меладрама «Я буду побач».**
**0.40 Серыял «Як выйсці замуж за мільянера-2». Заключная серыя.**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў».
**8.10 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**10.05** «Арол і рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**11.10, 23.20** Хачу ў тэлевізар!
**11.15, 20.05** Тэлебарометр.
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Пяцёрачка.
**12.25** «Зразумець і абясшкодзіць».
**13.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**15.05** Выбар гледачоў. Фэнтэзі «Персі Джэксан і мора пачвар».
**17.00 Фантастыка «Я, робат».**
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.10 Дэтэктыў «Метад Фрэйда-2».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**23.25 Меладрама «Чужаземка».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.55, 17.00, 23.45** «Калейдаскоп».
**8.15, 21.30 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.40 «Чырвоная палатка». Драма.**
**12.15** «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Алесь Чумакоў, Павел Сляпцоў, Алена Маслоўская.
**13.05** «Напеpад у мінулае».
**14.35** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**14.25** «Справы фамільныя». «Трамвайны марш».
**14.55** «Музеі Беларусі». Музей Беларускага Палесся.
**15.20** «Аляксандр Варашыла. Свой голас». Дак. фільм.
**16.05** «Гітара па крузе». Яўген Пальцаў, сцэнарыст, паэт.
**17.15 «Чалавек ніадкуль». Камедыя.**
**18.35** «Дзень радыё». Дак. фільм.
**19.00 «Табар ідзе ў неба». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Лістапад-2015». Тэлеверсія закрыцця XXII Мінскага міжнароднага кінафестывалю.
**22.50** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Савецкі космас: чатыры карalі». Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.35, 21.30** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Баскетбол. НБА. Мілуокі — Кліўленд.
**9.30** Хакей. Белнафтахім — Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Нёман» (Гродна).
**11.25** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Астана» — «Цмокі-Мінск».
**13.05** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Дынама» (Масква).
**15.00** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Вайводзіна» (Сербія) — БГК імя Мяшкова.
**16.25** Авертайм.
**16.55** КХЛ. «Спартак» — ХК «Сочы».
**19.20** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Лакаматыў-Кубань» — «Ніжні Ноўгарад».
**21.00** Свет англійскай прэм'ер-ліргі.
**21.50** Самба. Чэмпіянат свету.
**23.30** Баскетбол. НБА. «Мінесота» — «Мемфіс».

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/ф «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.40** «Фазэнда».
**11.15** «Брэйн-рынг».
**12.15 Маст. фільм «Флі-ка-2».**
**13.55** «Людміла Гурчанка. Дочкі-маці».
**14.55, 16.20 Меладрама «Любімая жанчына механіка Гаўрылава».**
**16.15** Навіны спорту.
**17.00** «Кропля ў кроплю».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Голас».
**23.20 Трылер «Метад». Сеанс чацвёрты.**

### СТБ

**6.05 «Афрамасквіч». Серыял.**
**6.55** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.15, 16.50** «Аўтапанарама».
**7.40 Трылер «Задыяк».**
**10.20** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40** «Культурная сталіца». Брэст.
**12.10, 13.40, 23.25 Маст. фільм «Леапард».**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**15.40** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Дарагая перадача».
**17.45 Камедыя «Ад 180 і вышэй».**
**19.30** «Тыдзень».
**20.25** «Ваенная тайна».
**22.35** «Спорт: сіла волі + характар». Дакументальны спецпраект.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** М/ф.
**8.35** «Ведаем рускую».
**9.30, 5.30** «Нітка да ніткі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Чаму я?»
**10.45 Серыял «Казкі мачахі».**
**14.15 Маст. фільм «Элвіс пакінуў будынак».**



**16.15, 22.00 Серыял «Паляванне на Берыю».**
**21.00** «Разам».
**0.25 Маст. фільм «Вій».**
**1.55 Маст. фільм «Спытай у пылу».**
**4.05 Маст. фільм «Прыватнае жыццё Пятра Вінаградава».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Мезальянс».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**13.20** М/ф.
**14.15** «Расія. Геній месца».
**15.10** «ХА». Маленькія камедыі.
**15.50** Яўген Петрасян — «Усмешка даўжынёю ў жыццё». Да 70-годдзя артыста.
**18.00** «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя Птушка».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30 Маст. фільм «Чужы твар».**
**0.20** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.55** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Ямо хаты».
**10.25** «Першая перадача».
**11.00** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «Паедзем, паядзім!»
**14.05** «Следства вядуць...»
**15.00, 16.20 Серыял «Час Волкава».**
**18.00** «Акцэнты тыдня».
**18.55** «Кропка».
**19.45 Серыял «Павуціннe».**
**23.15** «Прапаганда».
**23.45** «Уласны гонар».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.55, 19.05, 23.30** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 14.55, 16.10, 20.55** «Хатняя крама».
**10.45 Драма «Прывід».**
**13.00 Маст. фільм «Сахара».**
**15.05** М/ф.
**16.40 Серыял «Каломба».**
**18.00** «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.10 Камедыя «Прышэльцы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Пачатак».**

### ВТБ

**6.00** «Хатняя кухня».
**6.30** «Вялікая маленькая зорка».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Кухня 5».
**14.30** Серыял «Апошні з Магікян».
**16.00** «Дзікія гульні».
**17.00, 23.15, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**17.10** Баявік «Рэд».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.00** Трылер «Ілюзія падману».
**23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Кіно ў дэталях».
**3.30** «Лаві момант».
**4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**5.00** Серыял «Свацці».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Сланечнікі». Маст. фільм.
**12.20** «Легенды сусветнага кіно». Пітэр Фальк.
**12.50** «Расія, любоў мая!» «Гісторыя і культура Комі».
**13.20** «Хто там...»
**13.50** «Трапічны лес. Паўднёвая Амерыка». Дак. фільм.
**14.45** «Што рабіць?»
**15.30** Геніі і злодзеі. Аляксандр Максімаў.
**16.00** Раберта Аланья, Кацярына Шчарбачэнка і Расійскі нацыянальны аркестр. Канцэрт у Маскве.
**17.30** «Пешшу...» Масква заалагічная.
**18.00** Да 80-годдзя з дня нараджэння актрысы. «Людміла Гурчанка на ўсе часы». Вечар у Маскоўскім тэатры мюзікла.
**19.35** Да юбілею кінастудыі імя М. Горкага. «100 гадоў пасля дзяцінства».
**19.50** «Печкі-лавачкі». Маст. фільм.
**21.25** «Марыя Шукшына. Абсалютна асабістая гісторыя». Дак. фільм.
**22.20** Паслухайце! «Паэты Срэбнага стагоддзя».
**23.50** Кіно на ўсе часы. «Мілая Розі О'Грэйдзі». Маст. фільм.
**1.15** Р. Шуман. Сімфонія № 1 «Вясновая».
**1.55** «Шукальнікі». «Тайная вайна».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1985.
**7.00, 9.40, 11.00, 13.00, 14.10, 15.40, 17.00, 18.45, 20.20, 21.00, 23.20, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Крок з даху».
**8.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**13.20** «Галіна Вішнеўская. Вяртанне». 1992 год.
**14.45** Дак. фільм «Я сышью Вам сукенку».
**15.00** «Быў час». 2008 год.
**16.00** Маст. фільм «Формула вясёлкі».
**18.00** «Акулы пяра». Вадзім Казачэнка. 1997 год.
**19.20** Фільм-канцэрт «Рабіна на каньяку». 1989 год.
**20.35** Дак. фільм «Эканоміка ў пошуках ісціны».
**22.00** Маст. фільм «Першы тралейбус».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Алег Анофрыеў. 2008 год.
**1.05** Маст. фільм «Доўгія праводзіны».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».

### EUROSPORT

**5.00, 11.45, 14.15, 18.15, 22.15, 2.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**5.45, 11.00, 17.30, 21.30, 3.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**6.30, 10.30, 20.30** WATTS!
**8.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Найлепшыя моманты.
**13.00, 19.00, 23.00, 3.30** Веласпорт. Гонка на трэку Revolution Series.
**16.00, 1.00** Футбол. Кубак Еўропы. (U-21.)

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 3.00** Серыял «Пэт і Кэбедж».
**6.30** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**8.00** Камедыя «Як украсці дыямент».
**10.40** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**12.20** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**14.00** Камедыя «Калачы».
**15.30** «Камедыянты (шоу).
**16.00** Меладрама «Нявеста з таго свету».



**17.40, 22.00** Серыял «Вялікая школа».
**18.45** Камедыя «Праўдзівыя разнаскурых».
**20.20** Камедыя «Муж дзвюх жонак».
**23.10** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**0.50, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**1.15** Камедыя «Дзікая штучка».
**4.00** Меладрама «Каханне жыве тры гады».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.35** «Дачныя гісторыі».
**10.00, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**10.55** «Паненка і кулінар».
**11.30, 0.55** «Класныя мужыкі». Серыял.
**14.55** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.15** Маст. фільм «Смяротная схватка».
**19.30** «Без падману».
**20.20** Маст. фільм «Дзень Незалежнасці».
**22.55** «Асцярожна, махляры!»
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.55** «Тэрыторыя смерці». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.25** Драма «Джэры Магуаер».
**8.40, 2.00** Фэнтэзі «Гары Потэр і таемны пакой».
**11.20** Меладрама «Яна».
**13.30, 4.50** Прыгоды «Пітэр Пэн».
**15.20** Фэнтэзі «Гары Потэр і вязень Азкабана».
**17.40** Фантастыка «Галодныя гульні».
**20.00** Фантастыка «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
**22.30** Баявік «Прафесіянал».
**0.30** Меладрама «Апошняе каханне на Зямлі».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Меладрама «Кароткія сустрэчы».
**8.05** Драма «Бумеранг».
**9.45** Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчыны».
**11.15** Драма «Арда».
**13.30** Маст. фільм «Небяспечныя гастролі».
**15.10** Казка «12 месяцаў». Новая казка.
**16.40** Маст. фільм «Яраслаў. Тысячу гадоў таму».
**18.40** Камедыя «Вяселле па абмене».
**20.20** Баявік «Васьмёрка».
**21.50** Камедыя «Звычка расставацца».
**23.15** Драма «Чыстая перамога».
**1.10** Меладрама «Клоўны».
**2.55** Драма «Алеся».
**4.20** Драма «Франц+Паліна».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**6.50** Займальная навука.
**7.15, 8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Узлом Сістэмы.
**8.00** Зрабі або памры.
**9.20** Гонка да Паўднёвага полюса.
**10.10** Голая навука.
**11.00, 12.40, 20.10, 22.40, 0.20, 2.50** Навука будучыні Стывена Хокінга.
**11.50** Космас: Прастора і час.
**13.30** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**14.20** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**15.10** Сіла племені.
**16.00** Тайвань: востраў рыбы.
**16.50** Дзікая прырода Амерыкі.
**17.40, 19.20** Чалавек супраць YouTube.
**21.00, 1.10, 4.30** Прарыў.
**21.50, 2.00, 5.15** Конкурс аўтамабіляў будучыні.
**23.30, 3.40** Эвакуацыя Зямлі.

### DISCOVERY

**8.00** Склады.
**8.50, 21.00, 4.00** Голыя і напалоханыя.
**10.40** Падарожжа ў невядомасць.
**11.35** Як уладкаваны Сусвет.
**12.30** Нябачныя светы.
**13.25** Цуды Сусвету.
**14.20, 22.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**15.15, 23.00** Разбуральнікі легенд.
**16.10, 0.00** Трой.
**17.05, 5.35** Кубінскі хром.
**20.00** Хлопцы з Юкана.
**1.00, 3.00** Хуткія і гучныя.
**2.00** Акулы аўтагаргоў з Даласа.
**4.50** Цуды Сусвету.

# АСАЛОДА Ў ЛІСТАПАДЗЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Калі я ўпершыню некалькі гадоў таму трапіла на фестываль, зразумела: «Лістапад» — гэта свята, якое заўсёды з табою». Вядома, гэта не Хэмінгуэеў Парыж, дзе натхняючыя галеча і голад, дзе яркія апельсіны ў кабінецe дысануюць з фінансава бязрадасным жыццём, дзе бяздонныя і такія прывабныя бібліятэкі, гэта не літаральны Хэмінгуэй. Хаця... Нешта агульнае дакладна ёсць. У апошні дзень таго, першага, фестывалю, які я пражыла ад пачатку да самага канца, я была згодна яшчэ не спаць, каб толькі «Лістапад» працягваўся. Толькі ён такія ўмовы не прымае.




Можна паставіць пытанне: навошта гэты фестываль увогуле патрэбны, чым ён можа зацікавіць абывацеля і выцягнуць з утульнага дома? І гэтае пытанне будзе карэлявацца з вечнымі «дзеля чаго мы жывём?», ці «што галоўнае ў жыцці?», ці «як узаемадзейнічаюць чалавек і сусвет?». Разумееце, кожны з тых фільмаў, што паказваецца ў рамках фестывалю, створаны людзьмі, якія задаюцца тымі ж пытаннямі. Няхай гэта будзе гісторыя пра турботы эмігрантаў у далёкай Паўночнай Амерыцы, ці пра любоў да адсталай у развіцці сястры ў ізраільскай сям'і, ці пра забытага старога чалавека, у якога за плячыма бурнае жыццё — гэта датычыцца кожнага з нас. Тыя фільмы могуць дапамагчы нам зразумець сябе і наваколле, нагадаць пра справядлівасць, годнасць, талерантнасць, навучыць любові да ўсяго свету і пашырыць светапогляд. Яны могуць стаць глебай, якая дапаможа ў пэўны момант зрабіць правільны выбар. Яны могуць стаць тым сродкам (апаратам, калі хочаце), па якім адзін чалавек размаўляе з іншым. Рэжысёр з гледачом. З кожным паасобку. Бо ў «кожнага сваё кіно».

Андрэй Звягінцаў, што зняў «Вяртанне», «Выгнанне», «Алену» і «Левіяфана», дзесяць гадоў перад сваім першым поўнаметражным фільмам не працаваў у кіно — ствараў сябе. Здаецца, не было б тых дзесяці гадоў у Звягінцава — не было б і чатырох глыбокіх, трапных і таленавітых фільмаў. Не было б тых дзесяці гадоў — не было б чалавека-філосафа, які мае што сказаць праз кіно. Не было б тых дзесяці гадоў — не ўзнікла б тысяч пытанняў, жаданняў і нагод прыйсці да нечага лепшага, што даюць яго фільмы. Карціны «Лістапада» — гэта дыялогі з тымі, каму ёсць што сказаць. Давайце пагутарым, давайце пашырым усведамленне, давайце паставім сабе тыя пытанні, што нам прапануюць найлепшыя розумы чалавецтва (хай гэта і гучна сказана).

Праграма, што складаецца са 184 карцін 60 краін свету, традыцыйна падзелена на конкурсныя і пазаконкурсныя паказы. У рамках фестывалю пройдуць асноўныя конкурсы ігравога і дакументальнага кіно, конкурс «Маладосць на маршы», Конкурс маладога дакументальнага кіно — конкурс нацыянальных кінашкол, Нацыянальны конкурс (што праходзіць другі раз), Конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік».

Таксама будуць паказаны фільмы-пераможцы іншых кінафестываляў — іранская карціна «Таксі» Джафара Панахі, што атрымала «Залатога мядзведзя» ў Берліне; уладальнік Залатой пальмавай галіны Канскага кінафестывалю французскі фільм «Дзіпан» Жака Адзіяра; карціна «Голуб сядзеў на галіне, раздумваючы пра быццё» Роя Андэрсана, узнагароджаная «Залатым ільвом» у Венецыі. Варта звярнуць увагу на фільмы: «Маладосць» італьянскага рэжысёра Паола Сарэнціна, «Любоў» Гаспара Наэ (які праславіўся трэшавай сцэнай згвалтавання ў фільме «Незваротнасць» з Монікай Белучы), «Могілкі раскошы», абласканага Канскім фестывалем тайландскага рэжысёра Апічатпона Вірасетакула, апошні фільм выбітнага рускага аўтара Аляксандра Сакурава «Франкафонія»...

Няхай гэты пералік не выглядае як катэгорыя «абавязкова для прагляду», бо вылучэнне ўсяго цікавага з амаль двухсот карцін, здаецца, не мае сэнсу: напэўна, кожны фільм праграмы варты ўвагі. Затое назваць карціны паказваюць не ўзровень.

Стваральнікі кіно трымаюць у руках адзін з самых дзівосных і прыгожых спосабаў перадаць свае думкі, сказаць сваё слова, паставіць пытанне. Дэвіз сёлетняга фестывалю «Асалода для вачэй» абяцае нам сумяшчэнне ў асобах прадстаўленых рэжысёраў нейкай усеахопнай глыбіні з эстэцкім бачаннем. А гэта ўдвая складаней. Можна быць упэўненым: канструктыўны дыялог будзе.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*



■ На хвалі быцця

# ГОНАР І НАТХНЕННЕ

З КАЛАСАВІН мы вярталіся, калі ўжо ладна сцямнела. І хоць дзень быў насычаны рознымі сустрэчамі і гаворкамі, стома не адчувалася. Наадварот, настрой быў прыўзняты, святочны. Было прыемна, што такі ж настрой адчуваўся і ў нашых гасцей з Санкт-Пецярбурга, Калінінграда, Кіева, літоўскага Друскінінкая, якія па запрашэнні Дзяржаўнага музея Якуба Коласа прыехалі, каб адсвяткаваць 133-ю гадавіну з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры.

— Едучы сюды, я перачытаў многае, што звязана з Якубам Коласам, захапіўся яго паэмай «Сымон-музыка», — сказаў, выступаючы на ўрачыстасці, адзін з гасцей. — І зразумеў, што ваш Колас — пісьменнік планетарнага маштабу. Ён не толькі ваш, ён належыць усяму чалавецтву...

Я падумаў тады: «Колькі давялося нашым першапраходцам ад Скарыны і Сімяона Полацкага, ад Францішка Багушэвіча, ад Купалы і Багдановіча, ад сына гэтых стаўбцоўскіх палеткаў Кастуся Міцкевіча, які назваў сябе Якубам Коласам, ад пазнейшых Мележа і Танка, Быкава і Караткевіча даказваць сваёй адданай любоўю да Радзімы, сваім талентам і памкненнямі, каб беларусы сталі не толькі «людзьмі звацца», а занялі годнае месца ў супольнай сям'і народаў. Пераадольваючы самыя розныя перашкоды і адольваючы неверагодныя цяжкасці».

Мы шмат гаварылі потым пра ўзаемныя кантакты літаратараў, пра прыгажосць беларускай мовы, пра цудоўныя беларускія песні.

— Вы нават не ўяўляеце, як мы радуемся за вас, што ў вас тут мір і спакой, што вы так умееце адзначаць літаратурныя святы! — шчыра казалі замежныя госці.

Чуць такое было, несумненна, прыемна. Што і казаць, мы самі часам не заўважаем, як прыкметна ў нас вырасла за апошні час агульная культура ў адносінах да гістарычнай спадчыны, да культуры, да іншых сфер паўсядзённага жыцця людзей. Безумоўна, не ўсё так гладка, ёсць праблемы, але не заўважыць пазітыўных змен за апошнія дваццаць гадоў, якія адбыліся ў нашай краіне, было б яўна несправядліва.

Госця з Кіева, кіраўнік цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, казала мне ў прыватнай размове, што два гады іх сталічныя бібліятэкі не атрымлівалі ніводнага літаратурнага часопіса і толькі цяпер знайшліся грошы, каб выпісаць з новага года некалькі найменняў перыядычных выданняў.

«НУ, а цяпер давай пра дарогі!» — усміхнецца скептык. А чаму б не? Хіба нашы дарогі не адрозніваюцца ў лепшы бок ад дарог суседзяў, хіба не працягнуліся на нашых абсягах сучасныя аўтабаны, хіба не з'явіўся даволі прыстойны прыдарожны сэрвіс з сучаснымі аўтазапраўкамі, дзе ёсць магазіны, кавярні, месцы для адпачынку?

Хіба не павялічыўся паток турыстаў, хіба не аднаўляюцца старажытныя замкі і палацы?

Іншая справа, што нехта хоча большага і лепшага, гэта добрае жаданне, ды яно патрабуе крокаў ад ужо новай, больш яскраснай кропкі адліку.

Вельмі важна, што за гэтыя гады нашы людзі пачалі больш ясна ўсведамляць, што мы — краіна з багатай гісторыяй, уласнымі традыцыямі, што свабода і незалежнасць — не нейкія абстрактныя паняцці, а наша сённяшняя ява.

УСЯГО дванаццаць гадоў таму, калі я прыйшоў працаваць у замежную рэдакцыю беларускага радыё, яно вяшчала ў міжнародным эфіры чатыры гадзіны ў суткі на чатырох мовах. Сёння агульны аб'ём вяшчання міжнароднага радыё «Беларусь» складае 26 гадзін у суткі і нас можна слухаць у эфіры і інтэрнэце на васьмі мовах, уключаючы кітайскую.

Пошта прыносіць лісты, дзе слухачы пішуць, што яны шмат дазналіся пра нашы помнікі і славутых людзей, пра гісторыю і пра сённяшні дзень беларусаў.

І мы рады, што наша Беларусь паўстае ў вачах гасцей сучаснай еўрапейскай дзяржавай з цудоўным працавітым і адукаваным народам.

— Я хацеў бы жыць у Мінску, — сказаў мне падчас Коласаўскага свята музейшчык з Калінінграда. І гэта было для мяне яшчэ адным штрыхом для адчування гордасці за сваю краіну.

ХТО мог яшчэ не так даўно ўявіць, што на футбольным стадыёне, які адпавядае ўсім еўрапейскім стандартам, у невялікім беларускім горадзе Барысаве, будуць выступаць найлепшыя футбольныя клубы Еўропы, што на канцэртных пляцоўках Мінска свае майстэрства змогуць дэманстраваць зоркі сусветнага мастацтва, што многія нашы дзеячы навукі, культуры, мастацтва стануць лаўрэатамі прэстыжных міжнародных прэмій...

Але ўсё гэта — наша сённяшняя рэальнасць. Рэальнасць, якая не далася сама па сабе, рэальнасць, якая стала вынікам стваральнай працы нашых людзей, станаўлення нашай маладой суверэннай дзяржавы.

Ацаніць гэта і пайсці далей, развіваць і памнажаць усё найлепшае, ісці па шляху стварэння, а не разбурэння — вось што трэба нам цяпер, вось на што хочацца траціць свае талент, сілы, умение і майстэрства.

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ**

■ Паэтычным радком

# «НА ЗЯМЛІ МАЁЙ САРДЭЧНАЙ...»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Шчодры на цяпло лістапад прыцерушыў золатам апалай лістоты абсягі роднай зямлі. Па-восеньску суцішаная, мудрай выглядае зараз прырода. Куды ні кінь позірк — перад вачамі паўстае прыгажосць маладой нашай краіны. Клапатліва дагледжаныя палі зеленеюць новаю руннаю: гожыя вуліцы аграгарадкоў, гмахі старавечных і абноўленых гарадоў. І ўсюды — нястомны жыццёвы рух, паўсядзённы чалавечы занятак. Нашы суайчыннікі дужымі, энергічнымі рукамі нястомна працягваюць пачэсную справу папярэднікаў: будуюць маладую суверэнную краіну, імя якой — Рэспубліка Беларусь! І чым наша маладая краіна будзе пачута ва ўсім свеце, залежыць ад кожнага з нас. Ад нашай упартай працы і ад нашай духоўнай моцы. Мы, сучасныя жыхары Беларусі, заўсёды павінны памятаць, што на папялішчы самай кровапралітнай вайны нам выпала адбудавацца і жыць, што за наша мірнае зямное быванне заплачана неймаверна вялікая цана — у мільёны чалавечых жыццяў. Таму нашы памяць і свядомасць будуць заўсёды трывалымі, моцнымі. Таму непахісна гуманным застаецца погляд на свет і людзей. Мы зычым дабра і сабе, і іншым. Такі ён, міралюбівы і зычлівы, голас Бацькаўшчыны нашай у чалавечай супольнасці.**

*На маёй зямлі*
*спрадвечнай,*
*Дзе хадзілі часта войны,*
*Лёс заўсёды чалавечы*
*Быў журботна неспакойны.*
*То адны ішлі ватагі,*
*То другія неслі здзекі.*
*Тут крыжастыя іх сцягі*
*Ў прошласць канулі навекі.*
*На маёй зямлі пякельнай,*
*Дзе мярцвяча вецер*
*свішча,*
*Што была не раз*
*суцэльным*
*Вугляжарым папялішчам,*
*Да майго сюды прыходу*
*Пакаленняў не бывала,*
*Каб у розныя нягоды*
*За яе не ваявала.*
*Гэта я, дасюль адзіны,*
*Хто за ўсё жыццё ні разу*
*За захоп яе злачынны*
*Не даваў ружжом адказу.*
*Не хадзіў па жытнім полі,*
*Як дзяды мае, ў атаку.*
*Зубы сціснуўшы ад болю,*
*Над забітымі не плакаў.*
*Не хаваў астанкі-косці*
*У хатынях пагарэлых,*
*Тым, забітым,*
*не зайздросціў,*
*Хто зноў бачыць*
*ранак белы.*
*Я пражыў —*
*і працай-песняй*
*Год ад году быў заняты,*
*У раллю у ранак вясні*
*Ўпалі з рук маіх зярняты.*
*Гарады — мае — усталі,*
*Дзе гарбелі скрозь руіны.*
*Дух мой горды гартавалі*
*Будні новае краіны.*
*На зямлі маёй сардэчнай*
*Вас сустрэнуць*
*хлебам-соллю,*
*Ўсмешкай цёплай*
*чалавечай,*
*Чаркай звонкай у застоллі.*

* * *

*Навучыліся многаму*
*мы за вякі.*
*Запускаем навейшыя*
*ў свеце станкі.*
*Здабываем з вады*
*кіслапрод, вадарод.*
*Арашаем пустыні,*
*дзе быў недарод.*
*У нябёсах лятаем,*
*плывём пад вадой.*
*Водзім ціха сакрэты*
*з урану рудой.*
*Хмарачосы будуем з бетону*
*і шкла.*
*Міжпланетнага чуем*
*размахі крыла.*
*За вякі навучыліся*
*многаму мы.*
*Навучыцца б яшчэ быць*
*заўсёды людзьмі.*

* * *

*Калі птушкаю стаць —*
*толькі не воранам,*
*Што на полі смерці*
*вочы клюе.*
*Калі хмараю стаць —*
*дык не тою прачорнаю,*
*Што жывое калоссе*
*градам паб'е.*
*Калі дрэвам стаць —*
*дык не здраднай асінаю,*
*Што саромна за ўчынены*
*грэх дрыжыць.*
*Калі стаць валуном —*
*дык не тым, пакінутым,*
*Што на даўняй магіле,*
*амшэлы, ляжыць.*
*Калі стаць агнём —*
*дык не тым, раз'юшаным,*
*Што ад хаты пакінуў*
*адны вуглі.*
*Калі песняй стаць —*
*толькі той, што душамі*
*Завалодала, роднай*
*служыць зямлі*

**Мікола МЯТЛІЦКІ,**
**лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва**

# ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ

## ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА

## Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (ООО «ЗападИнвестСистемз»)

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием участников
ООО «ЗападИнвестСистемз»
30.09.2015 (Протокол №б/н)

г. Минск 2015

Общество с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (далее – Эмитент) на основании Протокола заседания Общего собрания участников от 30.09.2015 № б/н вносит следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (номер государственной регистрации 5-200-02-2513, дата государственной регистрации 03.03.2015) (далее – Проспект эмиссии):

1. Пункт 1.11 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

**«1.11. Исполнительный орган эмитента, с указанием фамилии, имени, отчества, года рождения, образования, всех занимаемых должностей, в том числе вне органов управления эмитента, в настоящее время и за три предшествующих года, размер доли в процентах в уставном фонде эмитента.**

Функции исполнительного органа – директора эмитента переданы по договору на управление компанией №37/УПиКО-2014 от 11.08.2014 г. Управляющей компании ООО «ТАПАС», Генеральный директор – Кривецкий Игорь Яковлевич, действующий на основании Устава:

| № п/п | Фамилия, имя, отчество | Год рождения | Образование | Занимаемые должности | Размер доли в процентах в уставном фонде эмитента |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Кривецкий Игорь Яковлевич | 1971 | высшее – окончил Самаркандское Высшее Военное Автомобильное Командное Училище в 1993 г.; Академию при Президенте Республики Беларусь в 2001 г. | с 2015 года по настоящее время Генеральный директор ООО «ТАПАС» до 2014 года ОАО «Белрыба» генеральный директор | 0% |

2. Пункт 2.5 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«**2.5. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается поручительствами:

1. Общества с ограниченной ответственностью «БелОбъектСтрой» на сумму 569 000 000 (Пятьсот шестьдесят девять миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 223050, Минская область, Минский р-н, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37, пом. 1-2.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691365787.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.01.2015 составляет **6 245** млн. белорусских рублей, на 01.07.2015 составляет 5 569 млн. белорусских рублей;

2. Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» на сумму 2 431 000 000 (Два миллиарда четыреста тридцать один миллион) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, офис 9.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 190976309.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.01.2015 составляет 95 667 млн. белорусских рублей, на 01.07.2015 составляет 63 117 млн. белорусских рублей;

3. Общества с ограниченной ответственностью «Агентство недвижимости «МЕГАПОЛИС» на сумму 3 000 000 000 (Три миллиарда) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220114, г. Минск, ул. Филимонова, д. 22, офис 8.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 191602738.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.01.2015 составляет **3 843** млн. белорусских рублей, на 01.07.2015 составляет 3 399 млн. белорусских рублей;

4. Общества с ограниченной ответственностью «Торговый центр Пассаж» на сумму 920 000 000 (Девятьсот двадцать миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 54б, 3-й этаж, каб. 11.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 192153999.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.01.2015 составляет 66 408 млн. белорусских рублей, на 01.07.2015 составляет 14 996 млн. белорусских рублей;

5. Унитарного предприятия по оказанию услуг «Белскладкомплекс» на сумму 1 000 000 000 (Один миллиард) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 223050, Минская область, Минский р-н, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37, офис 3.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691548397.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.01.2015 составляет **90 272** млн. белорусских рублей, на 01.07.2015 составляет 68 940 млн. белорусских рублей.

В случае неисполнения или ненадлежащего исполнения эмитентом обязательств перед владельцами облигаций требования к поручителям предъявляются в письменной форме с приложением выписки по счету «депо», подтверждающей право собственности владельца на данные облигации и возможность их отчуждения (отсутствие ограничений, связанных с обременением облигаций обязательствами). Данное требование должно быть представлено поручителю по его месту нахождения.

Поручитель отвечает в том объеме, за который поручается.

При получении требования поручитель обязан рассмотреть его в срок, не превышающий 15 (Пятнадцать) календарных дней. При принятии положительного решения по вопросу исполнения обязательств эмитента по облигациям платеж в пользу обратившихся к поручителям владельцев облигаций осуществляется поручителем в течение 30 (Тридцати) банковских дней.

Договор о предоставлении поручительства вступает в силу с момента его подписания эмитентом и поручителем и действует в течение всего срока обращения облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока обращения облигаций.

Действие договора о предоставлении поручительства прекращается после исполнения обязательств по облигациям (в том числе досрочного погашения всего выпуска облигаций) либо по истечении трех месяцев после окончания срока обращения облигаций, если владельцы облигаций не предъявят в указанный трехмесячный срок требований о выплате денежных средств по облигациям к эмитенту или к поручителю.

В случае принятия решения о ликвидации поручителя, а также в случае, если стоимость чистых активов поручителя, рассчитываемая на первое число каждого квартала, станет меньше объема находящихся в обращении облигаций, эмитент в течение двух месяцев с момента возникновения одного из вышеперечисленного основания осуществляет полную замену обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо в части недостающей стоимости чистых активов данного поручителя или осуществляет досрочное погашение данного выпуска облигаций либо его части. В случае принятия эмитентом решения о полной замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо его части, эмитент вносит соответствующие изменения в Проспект эмиссии и в Решение о выпуске облигаций. Эмитент обязан зарегистрировать такие изменения в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь и в семидневный срок известить о данном факте владельцев облигаций посредством публикации соответствующей информации в периодическом печатном издании, определенном эмитентом для раскрытия информации.

